№№105–106
(2833–2834)

18 ліпеня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія— па тэлефоне 328-68-71.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА:

«Ужо ляжачага, мяне працягвалі збіваць нагамі»

14 ліпеня на Кастрычніцкай плошчы сталіцы адбылася акцыя салідарнасці з затрыманымі па факце выбуху ў Мінску прадстаўнікамі апазіцыі.

На плошчы былі заўважаны намеснік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч, былы дэпутат Палаты прадстаўнікоў Сяргей Скрабец, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька і іншыя прадстаўнікі дэмакратычнага руху Беларусі. Удзел у акцыі прынялі некалькі дзесяткаў чалавек. Прысутныя на несанкцыянаваным мерапрыемстве патрабавалі ад беларускіх улад правядзення незалежнага расследавання, а таксама вызвалення ўсіх затрыманых па факце выбуху.

Літаральна праз некалькі хвілін пасля пачатку акцыі супрацоўнікі міліцыі пачалі выцясняць людзей з плошчы. Падчас "зачысткі" быў моцна збіты старшыня АГП Анатоль Лябедзька.

"Я пацярпеў за тое, што паспрабаваў высветліць у супрацоўнікаў міліцыі, які канкрэтна закон парушаюць людзі, што проста стаяць на плошчы, – распавёў карэспандэнту "Народнай волі" Анатоль Уладзіміравіч. – Адразу пасля гэтага з боку супрацоўнікаў міліцыі пачаліся адчувальныя "тычкі". Крыху пазней пяць ці шэсць чалавек "у чорным" узялі мяне "ў каробачку" і пачалі збіваць... Адзін з удараў быў вельмі моцным і прыйшоўся ў сонечнае спляценне... Адразу пасля яго ў мяне пацямнела ў вачах, я страціў кантроль над сітуацыяй і апынуўся на бруку... Ужо ляжачага, мяне працягвалі збіваць нагамі. І толькі пасля нечай каманды "Хватит!" мяне пакінулі ў спакоі. Амапаўцы проста пераступілі цераз мяне і пайшлі "працаваць" далей".

Пасля збіцця Лябедзька адчуў моцны боль у грудзях і звярнуўся ў шпіталь. "Дактары зафіксавалі ў мяне некалькі гематомаў, удары на спіне і грудной клетцы", – сказаў палітык.

Тым не менш звяртацца ў міліцыю па факце збіцця Лябедзька намеру не мае: "Гэта тое самае, што размаўляць на вуліцы са слупам. Задавальнення ніякага, і эфекту таксама – нуль. Таму ніякай заявы на неправамоцныя дзеянні супрацоўнікаў міліцыі я падаваць не буду".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ТЫМ ЧАСАМ

«Лябедзька сам паваліўся на зямлю»

На наступны дзень пасля інцыдэнту з удзелам Анатоля Лябедзькі з'явілася афіцыйная рэакцыя ўладаў. Радыё "Эхо Москвы" са спасылкай на інфармацыйнае агенцтва "Інтэрфакс" паведаміла, што па версіі намесніка начальніка Мінскага ГУУС Аляксандра Найдзенкі, падчас акцыі на Кастрычніцкай плошчы, якая праводзілася ў знак салідарнасці з арыштаванымі дэмакратычнымі актывістамі, Лябедзька сам паваліўся на зямлю, а супрацоўнікі міліцыі да яго нават пальцам не дакрануліся. Яны, маўляў, проста пераступілі цераз Лябедзьку і пайшлі далей выцясняць удзельнікаў акцыі з Кастрычніцкай.

Як кажуць, Масква слязам не верыць. Усе заўважылі: калі казаць пра асвятленне апошніх падзей у Беларусі, то Масква верыць толькі Лукашэнку. Хто ў кім зацікаўлены, той таму і падыгрывае.

Выдаткі на абарону ў наступным годзе павялічацца на 37 працэнтаў

Па словах першага намесніка міністра фінансаў Андрэя Харкаўца, выдаткі на нацыянальную абарону ў 2009 годзе павялічацца на 37 працэнтаў.

"Агульная сума выдаткаў на нацыянальную абарону ў кансалідаваным бюджэце складзе амаль 2 трыльёны беларускіх рублёў, што дасягае ўзроўню 1,3% ВУП, – сказаў Харкавец. – *У бюджэце будучага года прадугледжана фінансаванне ў поўным аб'ёме ўсіх адмысловых праграм у вобласці нацыянальнай абароны".*

ПАД ГРАДУСАМ

Пажыццёвая дыскваліфікацыя арбітра Сяргея Шмоліка

У мінулы аўторак адбылося пасяджэнне судзейскага камітэта асацыяцыі "Беларуская федэрацыя футбола", на якім быў разгледжаны інцыдэнт, які адбыўся падчас 13-га тура чэмпінату Беларусі па футболе паміж камандамі "Віцебск" і "Нафтан".

Нагадаем, што галоўны арбітр сустрэчы, рэферы ФІФА Сяргей Шмолік выйшаў на поле п'яны. Пасля матча Шмолік прайшоў у псіханеўралагічным дыспансеры медыцынскі агляд на прадмет ужывання алкаголю. Аналіз паказаў 2,6 праміле алкаголю, што ў пяць разоў перавышае норму (пасля 2,5 праміле наступае цяжкая ступень ап'янення).

Судзейскае пасяджэнне доўжылася 7,5 гадзіны, і ў выніку быў вынесены вердыкт аб пажыццёвай дыскваліфікацыі Сяргея Шмоліка.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.



Пакуль беларускія газеты, менавіта "Народная воля" і "Товарищ", будуць вымушаны друкавацца ў замежжы;

пакуль незалежная прэса не будзе распаўсюджвацца, як і дзяржаўная, – праз сістэму "Белпошты" і "Саюздруку";

пакуль грамадства будзе пазбаўлена магчымасці мець і выказваць розныя думкі і погляды на развіццё дзяржавы – ніякія выабры цывілізаваны свет сапраўднымі і легітымнымі не прызнае!

ИЗ-ЗА РЕШЕТКИ

Александр КОЗУЛИН:

«На свободу должен выйти не только я, тюрьму должны оставить Андрей Ким и Сергей Парсюкевич»

Так сложилось, что в последние пару месяцев от политзаключенного, экс-ректора Белорусского государственного университета, экс-кандидата в президенты Республики Беларусь Александра Козулина не поступало на свободу никаких сообщений. Но вот недавно ему разрешили встретиться с дочерьми. Понятно, разговор был обо всем, в том числе и о политике.

Вернувшись из тюрьмы, Ольга Козулина восстановила по памяти вопросы, которые она задавала отцу, и его ответы.

– Отставка Шеймана и Невыгласа – что это?

– Отставка Шеймана и Невыгласа имеет под за собой серьезную подоплеку. Избавление от Шеймана – это, я считаю, одно из условий, которое должен был выполнить Лукашенко для того, чтобы избавиться от грязного имиджа кровавых преступлений. Избавление от него – это сигнал Лукашенко определенным заинтересованным сторонам, что он готов к определенным действиям. Кстати, совершенно очевидно, что ни Шейман, ни Невыглас не были в курсе взрыва. И взрыв является лишь внешней причиной их отставки.

– Как можно прокомментировать интервью Лукашенко "Комсомолке"?

– В отличие от президента я не опускался до оскорблений и не собираюсь этого делать. Но большего лицемера, чем Лукашенко, в Беларуси, считаю, нет. И я готов это подтвердить документально, если понадобится судебное разбирательство.

Даже взять последние примеры.

Первое. Лукашенко говорит, что готов предоставить видео о том, что я повел разъяренную толпу на штурм тюрьмы. Так пусть он публично покажет пленку из моего уголовного дела по государственным каналам. Но предупреждаю, что записей там – на несколько часов.

Второе. Я не отрицал, что кушал с Лукашенко из одной тарелки. И пил не только пиво. Но на выборах 1994 года я голосовал не за Лукашенко, а за Кебича, так как считал, что "колхозник" не может управлять государством. Но затем, видя всенародную поддержку и познакомившись с ним лично, я решил, что я, возможно, ошибаюсь. Более того, в личном общении с ним, особенно на первых порах, я увидел человека, думающего о развитии Беларуси и о народе. В то время он слушал людей и прислушивался к советам профессионалов, учился у них, а его порыв и устремление действительно завораживали.

Но настоящее узнавание его произошло в 1999 году, после исчезновений Завадского, Красовского, Гончара, Захаренко, после внезапной смерти Карпенко, очень спортивного человека, – это все и многое другое перевернуло мое отношение к Лукашенко. А затем я стал более внимательным к фактам. Я могу сегодня совершенно точно сказать, что придет время, когда люди Беларуси будут в ужасе от правды, которая им откроется. А самое главное – от того, что они всему этому кошмару содействовали.

Всегда стоит дилемма, где ты можешь принести больше пользы: не себе, а людям.

Всегда стоит вопрос, когда наступает предел.

Быть рядом и есть из одной тарелки с человеком, когда знаешь его подноготную и мысли, когда знаешь, чем запятнаны его руки... В этом отношении пусть каждый делает выводы сам.

Третье. Что касается того, что оппозиция просит не выпускать меня из тюрьмы, интересно, кто именно просит. Пусть назовет имена. Заодно проверим, говорит ли Лукашенко правду. Обычно он вообще оппозицию в упор не видит, она для него – "отморозки", а тут вдруг прислушался к ее мнению, взывает к ней.

Кстати, я очень рад за Лукашенко, что он наконец-то признал Богом данного ему сына Николая. Хотя на выборах 2006 года от него отказался, даже не вписав его в декларацию (здесь, кстати, опять возникает вопрос честности). Хорошо было бы, чтобы еще про маму-врача не забывал...

– Нет боязни, что в отношении тебя могут быть более жесткие репрессии со стороны власти?

– Я знаю, что меня с удовольствием отправили бы вслед за Карпенко, Захаренко и другими. Более того, у меня есть информация, что КГБ и сегодня рассматривает этот вариант. Но в отличие от власть имущих я не боюсь смерти и не боюсь правды. А для них – даже правда смертельна.

Я еще раз заявляю о том, что у меня нет никаких показаний к инфаркту, к инсульту, пищеварительным отравлениям. Все внутренние органы у меня абсолютно здоровы. Сейчас я собираюсь жить долго и упорно. Я, конечно, понимаю, что могут быть предприняты грязные провокации против моих дочерей. Но полагаю, что такая низость со стороны властей, как и моя внезапная смерть, приведет к очень тяжелым последствиям для властей. Здесь уже просто санкциями со стороны мирового сообщества вряд ли можно будет отделаться.

– Почему Лукашенко так упорно держит тебя в тюрьме, невзирая на аресты счетов "Белнефтехима", международное осуждение?

– На этот вопрос может ответить каждый думающий человек. Лукашенко везде демонстрирует и кричит, что Козулин "нулевой", что он не нужен никому: ни власти, ни оппозиции. Но что-то никого так долго в тюрьме не держит, и, видимо, не только отдельные представители в оппозиции боятся моего выхода, но больше всего боится этого сам Лукашенко.

Если ты так силен и так сильна твоя власть, так в чем проблема?

– Как думаешь, в ближайшее время Лукашенко выпустит тебя на свободу?

– Мои прогнозы неутешительны, как неутешительно и то, что я незаконно сижу в тюрьме уже почти два с половиной года. Я думаю, что выйду не раньше следующего года. А вообще, не надо забывать о том, что мой выход зависит не только от Лукашенко. Он зависит еще и от меня. Я ставлю вопрос так: на свободу должен выйти не только я, тюрьму должны оставить также Андрей Ким и Сергей Парсюкевич. Кроме того, я полагаю, что на нашем освобождении должен быть положен конец политическим репрессиям в Беларуси.

В отличие от Лукашенко, я ему не враг, а тот человек, который искренне желает ему добра, как и каждому человеку. Вопрос в том, готов ли он вместить это в свое сознание. Лукашенко создал очень много непреодолимых проблем. Но сейчас стоит на пороге самых кардинальных решений – и для себя, и для страны. Я ему желаю остановиться вовремя на краю пропасти, упав в которую, не подняться на протяжении многих жизней. Пусть подумает, что его карма тяжким грузом ляжет на его близких.

Находящийся в заключении лидер социал-демократов высказался и на другие актуальные темы.

Выборы

– Лукашенко говорит, что он сделает самые демократические выборы. Что это значит? Он действительно постарается часть наблюдателей допустить к подсчету голосов, позволит им лично посчитать бюллетени. Но я уверен, что в таком случае считать они будут уже бюллетени, подкинутые во время досрочного голосования, которое ЦИК попытается довести до максимально возможного предела.

Лукашенко со всей искренностью в глазах и речах сделает все, чтобы обмануть в очередной раз весь мир.

ЕС должен поставить жесткие условия по проведению выборов в Беларуси, а именно:

1.Прозрачные урны. ЕС должен передать Беларуси в дар прозрачные урны с требованием использовать их в кампании. И в Украине, и в Казахстане – это норма. В связи с тем, что на этих выборах досрочное голосование в некоторых местах будет достигать 70 процентов, то международные наблюдатели будут считать уже подложенные бюллетени досрочного голосования. Прозрачные урны позволят фотографировать их и контролировать их неприкосновенность.

2.В каждую избирательную комиссию должны быть допущены наблюдатели от Объединенных демократических сил.

3.Должен быть предоставлен абсолютный допуск к государственным СМИ.

4.Представители оппозиции должны быть допущены к фотографированию протоколов. На практике протоколы составляются в двух экземплярах, чистыми подписываются членами комиссии, а потом вносятся любые данные.

В парламент пройдут до 10 человек из тех, кто называет себя демократами. Это будут те, которых, как сказал Лукашенко, он протащит за уши. Это будут его люди.

Для Лукашенко эти выборы очень важны. Но, к сожалению, он опять обманет самого себя.

***

Рассказывая о встрече с отцом, Ольга Козулина подчеркнула: администрация исправительной колонии на этот раз увеличила продолжительность встречи политзаключенного с родными до трех часов вместо двух, как это было раньше. *"За время более чем двухлетнего заключения стараюсь поддерживать корректные отношения со всеми, в том числе и с руководством колонии",* – прокомментировал А.В.Козулин недавнюю вторую годовщину вынесения судебного приговора.

Несмотря на ограниченные временные рамки, политик не остался в стороне от событий, которые волнуют всю страну. *"Я глубоко сожалею по поводу произошедшего взрыва и сочувствую пострадавшим, а также их семьям. Несмотря на крушение очередного мифа о стабильности как о достижении действующей власти, надо найти ответ на вопрос, кому июльская трагедия была на руку и кто пожинает на чужом несчастье политические дивиденды, кидает за решетку активистов оппозиции, нагнетает обстановку перед выборами. Взрыв был осуществлен профессионалами, имел характер, направленный на поражение ног. Рассчитан был на то, чтобы посеять панику, а не убить. Возможная гибель невинных людей была бы персональной дискредитацией так называемого "гаранта стабильности". Много ли у нас в стране профессионалов, способных так грамотно изготовить взрывное устройство? Полагаю, их следует искать в силовых ведомствах, подчиненных Лукашенко, а не среди демократов, на которых прорежимная пресса пытается повесить всех собак. Неотвеченным остается также вопрос, как Служба безопасности позволила господину Лукашенко приблизиться к месту взрыва? Тем более что по законам жанра первый взрыв может быть только отвлекающим. Это свидетельствует либо о вопиющем непрофессионализме сотрудников охраны, либо о том, что Лукашенко ЗНАЛ, что второго взрыва не будет. На человеке, называющем себя главой государства, лежит и моральная ответственность за то, что организаторы концерта немедленно не остановили его и не обеспечили эвакуацию. А ведь первую бомбу нашли еще за несколько часов до взрыва, могла быть, не дай Бог, и третья, четвертая",* – сказал А.В.Козулин во время встречи с дочерьми.

Народная Воля http://www.nv-online.info
18 ЛІПЕНЯ 2008 г.

ФОРУМ

«Спадар Мех, вялікая вам павага за вашу пазіцыю!..»

Матэрыял "Зачистка" ("Н.В.", 11.07), у якім распавядалася аб тым, як кобрынскі інжынер ААТ "Белтрансгаз" Аляксандр МЕХ вырашыў балатавацца ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, за што яго, па сутнасці, і звольнілі з працы, выклікаў на форуме нашага сайта самы вялікі водгук чытачоў. Што кажа народ?

Семен Семеныч:

– Александр Мех – нормальный парень, зря с ним так поступили. Им гордиться надо, а его уничтожают. П.Шеремет по поводу таких очень правильно написал: "Поскольку в стране власть сконцентрирована в руках спецслужб, поскольку майоры КГБ давно действуют в Беларуси безнаказанно, каждый житель страны – потенциальная жертва неадекватности зарвавшихся чекистов".

Трымайся, Саша!

Владимир:

– Как бы они ни дергались, все равно их время проходит. Боятся, поэтому так и делают. Звезды все расставят на свои места. Молодец Мех! Не нужно их бояться. Они должны бояться таких, как ты. Отмирающее поколение проигрывает на глазах. Демократия победит тоталитаризм!

Козіч:

– Спадар Мех, вялікая вам павага за вашу пазіцыю! Бо ваша пазіцыя – гэта момант праўды, трымайцеся, і, дай Бог, нешта зменіцца!

Анатолий Иванович:

– Александр Мех действительно честный и мужественный гражданин. Те, кто пытается его запугать, совершенно аморальные и никчемные людишки. Но придут другие времена, и им придется отвечать по Закону за свои угрозы и произвол.

Sasha:

– Боже мой... Если раньше у меня и были какие-то сомнения насчет всего этого шума по поводу демократичности выборов, то сейчас их нет.

Это же не государство – у них нет ничего святого. И если они столько усилий прилагают, чтобы не пропустить одного человека в этот так называемый парламент, то я могу себе представить, на что они идут, чтобы их "батька" остался у власти! Прав был мой дедушка, когда говорил про коммунистов в советское время, что все они – нечисть (и как я с ним спорил будучи "честным", "правильно" воспитанным советской школой зеленым комсомольцем, – просто стыдно сейчас за это). Только не в коммунистах дело как таковых – это просто группа людей-оборотней, у которых нет ничего святого, как бы они ни назывались. Бедная земля – погрязла навеки в болото.

В одно верю – если при этой стае волков находят смелость открыто заявлять о своей позиции такие, как Саша, – еще есть надежда... Саша, низкий поклон тебе! Ты человек, которому всегда можно без оглядки пожать руку! Я верю, что тебя ничто не сломает! Удачи тебе и твоей семье!

Uladzimir:

– Отличная работа! Теперь надо это распространить по всей Беларуси. И тогда Александра Меха обязательно изберут. Эти двое, которые его собеседники, просто наглецы, нарушающие даже лукашенковские законы.

Иван:

– Текст записанного разговора – это готовый материал для листовки, которую нужно в большом количестве распространить и в Кобрине, и в других городах страны... ОБЯЗАТЕЛЬНО!!! Не Политрады собирать, а подготовить материал – и быстренько людям!!!

Валентина:

– Все-таки что-то сдвинулось с мертвой точки в обществе! В Солигорске директор школы в знак протеста против отчисления Ивана Шилы с работы ушла, не тайно, а открыто высказавшись о существующей системе... По поводу "живого щита" масса людей не отмолчалась... Теперь кобринский показательный случай с Александром Мехом... Это здорово обнадеживает! Спасибо вам, люди!!!

НЕЗЛОБИВЫЕ ЗАМЕТКИ

Семен БУКЧИН

БЕККЕТ В КОБРИНЕ, или ПОЛНЫЙ АЛЛЕС

Познакомившись с опубликованной 11 августа в "Народной воле" беседой под названием **"Вопрос такой – что либо вы с нами, либо вы против нас, вот и все!",** я понял, что знаменитый драматург Самуэль Беккет и другие авторы мирового театра абсурда, как принято нынче говорить, отдыхают.

Этот матерьяльчик, в котором беседуют трое людей из районного города Кобрина, на самом деле еще то "В ожидании Годо"! Кому случилось видеть или читать эту беккетовскую пьесу, получившую известность со второй половины минувшего столетия, помнят, что там ведут странный диалог двое героев. Они все время ждут и говорят о приходе некоего Годо, который так и не появляется. В кобринской пьеске участников не двое, а трое. И говорят они тоже о чем-то вполне ими осознаваемом, но в то же время вроде и не совсем ясном. Что-то вроде известной детской игры, в которой предлагается "а" и "б" не говорить, "черное и белое не носить" и т.д.

Эти трое более чем реальные фигуры: начальник Кобринского управления магистральных газопроводов ОАО "Белтрансгаз" г-н Галашко, его подчиненный инженер г-н Мех и начальник Кобринского отдела КГБ г-н Басько. Но изъясняются они вполне в духе героев Беккета. Я подумал: через Кобрин, казалось бы, не проходят пути мировой драматургии, тем более абсурдистской, но, видимо, так велика сила модернистского искусства, что оно проникло и в наши районные глубины.

Следя за развитием этой сверхсложной кобринской встречи, нельзя не заметить, что г-н Мех пытается время от времени прорвать абсурдистскую логику жанра и внести некую реалистическую ноту. Но г-н Басько строго следит за соблюдением стилистики. Он объявляет г-ну Меху, что тот находится у них "на особом счету", но по какой причине, не указывает. Несомненно, чувствуя себя одновременно орудием некоей Высшей Силы и наследником царского премьера Столыпина, г-н Басько заявляет, что *"мы обеспечиваем социально-политическую стабильность в нашем городе... нам не нужны какие-то потрясения или какие-то возможные, значит, изменения в плане дестабилизации общества"*. И далее он предлагает г-ну Меху прямо *"уточнить"* свое место *"в свете будущих политических событий"*.

Какие события имеются в виду – г-н Басько не уточняет. Предполагается, что г-н Мех сам должен об этом догадываться.

Г-н Мех между тем испытывает определенные затруднения. Он вроде и догадывается, но считает нужным прежде всего подчеркнуть, что *"никакого закона никогда не нарушал, действовал всегда в рамках действующего законодательства"*. И тут включается его начальник г-н Галашко. Он прямо спрашивает подчиненного: *"Ты вот включаешься активно в выборную кампанию в качестве кандидата в депутаты или нет? Есть такое намерение?"*.

Г-н Мех вынужден под таким напором начальника признать, что "намерение есть". Но одновременно опять спешит оговориться, что в его действиях нет *"ничего противозаконного"*. Г-н Галашко как будто и не настаивает на том, что в действиях г-на Меха есть что-то противозаконное. Он просто по-товарищески, из лучших побуждений советует г-ну Меху не *"лезть"*, поскольку у того *"нет электората"*. Но г-ну Меху почему-то кажется, что электорат у него есть и *"очень мощный, сильный, серьезный"*, а *"проблема больше всего с подсчетом голосов"*. И вообще, он за необходимые народу реформы, вот и система образования у нас *"неправильная"*...

Тут, натурально, не выдерживает г-н Басько, он заявляет, что г-н Мех *"не владеет ситуацией"*, в то время как *"мы реально держим на пульсе электората"*. Что они держат на этом самом пульсе, видимо, составляет серьезную государственную тайну. И вообще г-ну Басько надоедает это хождение вокруг да около, и он прямо объявляет г-ну Меху: *"Вопрос такой – либо вы с нами, либо вы против нас, вот и всё!"* Естественно, что за такой постановкой "вопроса" следует горьковская формула: *"Если враг не сдается – его уничтожают"*.

Буквально прижатый к стене г-н Мех лепечет что-то вроде того, что он *"всегда с народом"*. На что г-н Басько гордо бросает : *"Вы не обобщайте"*. Это видимо, должно означать: ты, мол, не возносись, не присваивай себе роль выразителя народных интересов. Но когда г-н Мех в отчаянии спрашивает: *"Вы пришли сюда сказать мне, чтобы я не участвовал в выборах. Так получается?"*, г-н Басько отвечает: *"Я не для этого пришел"*.

Супербеккетовский ответ. Выяснял-выяснял, грозил-грозил, а в результате – *"не для этого пришел"*.

А для чего? Но разве абсурдистские пьесы пишутся для того, чтобы давать ясные ответы на четко поставленные вопросы? Вот и в кобринской пьесе все участники стоят на страже закона, но все-таки один не совсем правильно понимает этот закон, и двое пытаются ему это втолковать. Г-н Галашко буквально на пальцах объясняет г-ну Меху: *"Но вот нас двое, и мы двое будем действовать по закону"*. А действовать по закону для г-на Галашко, как выясняется, означает уволить с работы г-на Меха. На этот счет, подчеркивает кобринский газовый начальник, не следует заблуждаться. Может быть, г-н Мех предполагает, что когда он пройдет в депутаты, то они с Андреем Антоновичем (Галашко вместе с Басько) уволятся с работы? Как бы не так! *"Ты будешь безработный... За что будешь семью кормить? В Кобрине на работу тебя никто не возьмет"*, – объясняет г-н Галашко непонятливому подчиненному. И, вероятно, уже в отчаянии прибегает к единственно доступному ему "сильному" иностранному выражению: *"Это же полный аллес!"*

Далее г-н Галашко и г-н Басько принимаются обсуждать такую животрепещущую проблему, как возьмут или не возьмут г-на Меха на работу в Польше. И приходят к выводу, что возьмут. Реплика г-на Меха *"А при чем здесь Польша?"* оставлена без внимания. В общем, получается, что *"молодой, здоровый, образованный, энергичный специалист и человек, семьянин, не прогульщик, не алкоголик"* (характеристика, выданная г-ну Меху г-ном Галашко) почему-то больше нужен в Польше, а не в Беларуси.

Дав все-таки г-ну Меху какое-то время на раздумья, г-н Галашко и г-н Басько заявляют, что у них *"вопросов больше нет"*. Но перед тем, как опустится занавес, г-н Басько предупреждает г-на Меха, что *"если появится публикация в интернете"*, то он *"тоже в рамках закона все сделает"*. Как и положено в абсурдистской пьесе, какая публикация имеется в виду и что именно намерен сделать г-н Басько в случае ее появления, – не уточняется.

Настоящим модернистским финалом этого спектакля выглядит обращение г-на Меха к г-ну Галашко: *"Владимир Михайлович, подпишите мне заявку на получение листовой стали"*.

Жизнь продолжается! Оказывается, листовая сталь все-таки важнее...

Послесловие

Можно, конечно, перефразируя Сталина, сказать, что *"эта штука"*, поставленная в Кобрине, посильнее Беккета... В любом случае, поразительна ее адекватность образу сегодняшней, находящейся под тотальным полицейским контролем Беларуси!

Понятное дело, районному кагэбисту спустили инструкцию, как готовиться к выборам, из "области", а последним – из столицы. Вот и проводится "профилактика"... Шпионов в Кобрине, видимо, нет, антигосударственные заговоры не составляются. А служба есть служба. И вот приходит начальник райотдела КГБ побеседовать "по душам" с оппозиционером, намеревающимся выставить свою кандидатуру на предстоящих выборах. Не повесткой вызывает... Хотя мог бы... А демократично так ведет разговор с рядовым инженером в кабинете его начальника. Нормальная ситуация для Беларуси, в которой, по словам бессменного белорусского президента, *"выборы всегда были более демократичными, чем у других государств – наших соседей, в том числе в странах ЕС..."*.

Оказывается, это и есть настоящая демократия, когда представитель спецслужбы "беседует" с возможным кандидатом в депутаты, пытаясь внушить, что негоже ему "лезть" со своей кандидатурой, когда "наверху" уже все согласовано насчет того, кто будет баллотироваться по их городу и району. В общем, есть чему поучиться "гнилому Западу" у демократической Беларуси. Видимо, такие методы – это и есть то, что Лукашенко недавно назвал *"принципами безусловного соблюдения законодательства всеми участниками выборов, обеспечения порядка и социально-политической стабильности в обществе"*. Просто на Западе не понимают настоящих принципов! А они как раз и заключаются в активном участии спецслужб в подготовке и проведении выборов! Возможно, кому-то покажется, что начальник Кобринского райотдела КГБ нарушал закон, в том смысле, что пытался препятствовать гарантированному Конституцией праву гражданина избираться в высшие органы власти.

И совершенно напрасно! Потому что ничего такого г-н Басько не нарушал. Не нужно путать божий дар с яичницей! Г-н Басько, согласно поставленной задаче, обеспечивал порядок и стабильность. А г-н Галашко ему в этом святом деле, как и положено ответственному начальнику, помогал.

Президент ведь предупреждает: *"Так называемые оппозиционеры сегодня ждут, чтобы власть их где-то начала прессовать, потому что сами они не пройдут"*. Ну разве можно назвать задушевную беседу, состоявшуюся в кабинете г-на Галашко с г-ном Мехом, прессингом? Это ведь по сути отцы родные с неразумным ребенком разговаривали, наставляли на путь истинный. Ну пригрозили увольнением... Так ведь все для блага своего же дитяти... Ведь сам президент, хотя выборы еще не состоялись, уже знает, что оппозиционеры "не пройдут". Так чего ради трепыхаться?

Но вместе с тем президент дает полную свободу своему народу. *"Наш народ,* – говорит президент, – *должен определиться, кто будет в парламенте, и не надо лишать его этого права и тем самым его унижать"*. Похоже, однако, что раньше других "определяют", кто будет в парламенте, и при этом, естественно, никого не унижают, наши спецслужбы. Но разве они не часть нашего народа? И вообще, "органы никогда не ошибаются".

Помните, кто это сказал? То-то!

Даходамі апазіцыянераў зацікавіліся падаткавікі

Прадстаўнікоў дэмакратычных партый і праваабаронцаў выклікаюць у падатковыя органы. Пра гэта БелаПАН паведаміў праваабаронца Валянцін Стэфановіч.

Паводле яго слоў, падатковыя органы і супрацоўнікаў дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК зацікавілі даходы лідэра Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ) Сяргея Калякіна, намесніка старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі, лідэра Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) Анатоля Лябедзькі, актывіста кампаніі "Еўрапейская Беларусь" Дзмітрыя Бандарэнкі. Таксама, паводле слоў праваабаронцы, раней дэкларацыі аб даходах павінны былі прадставіць старшыня грамадскага аб'яднання "Беларускі Хельсінкскі камітэт" (БХК) Алег Гулак, члены БХК Таццяна Процька і Дзмітрый Маркушэўскі, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі, сам В.Стэфановіч, а таксама члены іх сем'яў.

– Паколькі 11 ліпеня я атрымаў адпаведную позву, я з'явіўся ў дэпартамент фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Мінску і Мінскай вобласці 14 ліпеня. Выклік быў дзіўным: я ўжо падаў у падатковую інспекцыю дэкларацыю аб даходах і маёмасці за 2007 год, а таксама аналагічныя дэкларацыі сваякоў. У дэпартаменце ў мяне ўзялі пісьмовыя тлумачэнні аб тым, што дэкларацыя мною была пададзена, – паведаміў В.Стэфановіч.

Сяргей ПУЛЬША.

Господдержка предприятиям изменится?

Министерство финансов предлагает изменить формы государственной поддержки предприятий, перейдя от прямой поддержки к поддержке в виде возмещения процента за использование кредита.

"Прямые формы господдержки будут сокращены до уровня уже принятых решений президента и правительства, дополнительных ресурсов не планируется", – заявил на заседании Совета министров в Минске первый заместитель министра финансов Андрей Харковец, представляя проект бюджета на 2009 год, сообщает "Интерфакс".

За неделю в Беларуси на водоемах погибло 32 человека

Основными причинами смертей являются нарушение правил безопасности на воде, купание в неохраняемых водоемах и в состоянии алкогольного опьянения.

"С 7 по 13 июля по республике на водоемах утонуло 32 человека, – говорит специалист Центрального совета ОСВОДа Виктор Пригодич. – *Около 60% из них находились в состоянии алкогольного опьянения. Это было и остается главной причиной трагедий на воде"*.

В ОСВОДе отмечают, что эти показатели почти в два раза выше прошлогодних. Однако пока было не так уж много погоды, "пригодной" для купания.

Валерия ЕСИНА.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

«Няхай зараз дзяржава кампенсуе нашы перажыванні»

У мінулы аўторак карэспандэнт "Народнай волі" наведаў у 6-й Мінскай гарадской бальніцы тых, хто пацярпеў у ноч на 4 ліпеня.

Як вядома, 6-я бальніца прыняла на сябе галоўны "ўдар". У тым сэнсе, што менавіта сюды прывезлі больш за 30 пацярпелых пасля выбуху каля мінскай стэлы, і да гэтага часу многія з іх яшчэ знаходзяцца ў бальніцы.

– У гэты панядзелак у нас яшчэ заставалася 19 чалавек, – распавядае выконваючы абавязкі намесніка галоўнага ўрача па траўматалогіі Павел Пашук. – Зараз ва ўсіх іх нармальны стан. Не тое што раней...

"Тое, што адбылося ў ноч на 4-е – гэта проста жах, – працягвае размову Павел Паўлавіч і ўспамінае: – Пазней на ток-шоу сказалі, што гэта быў хуліганскі ўчынак. Якое тут хуліганства?! Гэтыя гайкі ляцелі, як кулі! Я аперыраваў дзяўчынку, дык у яе ад удару гайкі ў бярцовай косці кратэр утварыўся. Так усё павырывала. Сіла была такая, што гайкі аб чалавечыя косці сплюшчваліся і дэфармаваліся. І гэта называецца хуліганствам? Гэта самы сапраўдны падрыхтаваны выбух! Мы тады тэрмінова ноччу мабілізавалі ўвесь персанал, які быў, – медсёстры прыязджалі на таксі, санітаркі... І праз трыццаць хвілін усе былі на месцы. Увесь калідор быў заняты пацярпелымі – да рэнтгенаўскага кабінета. У пяць гадзін раніцы ўсё практычна было скончана. Праўда, 17-гадовага Мішу давялося аперыраваць больш за шэсць гадзін. Гэта самы цяжкі пацярпелы. У яго з цела дасталі дзесяць гаек – раненні дыяфрагмы, пазваночніка, печані, пашкоджанні грудной поласці. Паламаны рука і нага. Вельмі цяжкі пацыент быў! Усім жа зразумела, што, калі не спыніць крывацячэнне печані, то наступае смяротны зыход. Да таго ж заўсёды вельмі цяжка сшываць тканкі печані. Швы прарэзваюцца. І, на жаль, адна гайка ў хлопца ў печані так і засталася – мы не змаглі яе дастаць. Яна вельмі глыбока засела, і калі мы хацелі яе дастаць, то адкрывалася моцнае крывацячэнне. Так што часова вырашылі яе пакінуць, але затым, натуральна, будзе зроблена паўторная аперацыя. А ўвогуле, я хачу сказаць, што наступствы маглі быць куды больш сур'ёзныя, калі б гайкі разляталіся не мэтанакіравана – па нізе. Гэта не быў хуліганскі ўчынак..."

На трэцім паверсе бальніцы – дзве палаты з пацярпелымі. Адна – мужчынская, другая – жаночая. Без доўгіх роздумаў спыняюся ля апошняй. Усё жтакі жанчыны больш цікава расказваюць...

– Такі, відаць, ужо мой лёс, – уздыхае Таццяна Васільеўна Манчук. – Справа ў тым, што два месяцы таму я зламала правую нагу. Ужо знялі былі гіпс, і раптам знаёмы мне кажа: "Табе трэба нагу "расходжваць", пайшлі прагуляемся на салют і канцэрт". Вось і прагулялася, "расхадзіла" нагу. Зараз ляжу тут з ужо "прастрэленай" левай нагой. А ў суседняй палаце – мой знаёмы.

"Выбух адбыўся так, як быццам мне петарду нехта пад ногі кінуў, – дадае яна. – Але моцная была выбуховая хваля. Такая, што нават болі не адчула. Падхапілі на рукі, па дарозе ў бальніцу аказалі першую дапамогу. Ужо ў бальніцы дасталі са ступні шкло, а з унутранага боку калена – падшыпнік і гайку. Ніколі ў жыцці болей не пайду ні на якія ўрачыстасці.

– Ці казалі вам што-небудзь наконт матэрыяльнай кампенсацыі? – пытаюся на развітанне ў жанчын.

– Хацелася б, – у адзін голас кажуць яны. – Гэта ж дзяржава рэкламавала свята і запрашала на канцэрт. Дык калі не змаглі зрабіць небяспечным знаходжанне там людзей, няхай ім кампенсуюць маральныя і фізічныя перажыванні. Не дай ім Бог каму такое!

Алесь СІВЫ.
Фота аўтара.

У ДТЗ пацярпела чатырохмесячнае дзіця

Здарэнне адбылося ў Мінску на вуліцы Бельскага.

Як паведамілі ва ўпраўленні ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, 36-гадовая жанчына, вадзіцель аўтамабіля "Аўдзі", павярнулася на плач чатырохмесячнага сына, які знаходзіўся на заднім сядзенні не ва ўтрымліваючым крэсле, а ў калясачнай люльцы. У выніку машына выехала на сустрэчную паласу, дзе сутыкнулася з аўтамабілямі "Крайслер" і "Рэно", што рухаліся ў сустрэчным напрамку.

У момант ДТЗ люлька разам з дзіцем упала з задняга сядзення. Хлопчык атрымаў закрыты пералом цемянной косці і быў шпіталізаваны ў лячэбную ўстанову.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
18 ЛІПЕНЯ 2008 г.

У Маладзечне асвяцілі помнік Яну Паўлу II

Пад вечар 13 ліпеня 2008 г. мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч разам з Апостальскім Нунцыем у Беларусі арцыбіскупам Марцінам Відавічам і шматлікімі святарамі ў прысутнасці прадстаўнікоў дзяржаўнай улады цэлебраваў святую імшу ў парафіі св. Юзафа ў Маладзечне. Падчас літургіі арцыбіскуп Тадэвуш таксама асвяціў помнік Слугу Божаму Яну Паўлу II.

У сваёй гаміліі мітрапаліт Тадэвуш нагадаў прысутным пра постаць Вялікага Папы Яна Паўла II і яго заклік – не баяцца і адчыніць дзверы Хрысту. Арцыбіскуп Тадэвуш таксама выказаў упэўненасць у тым, што помнік Слугу Божаму Яну Паўлу II будзе нагадваць людзям не толькі пра гэтага вялікага грамадзяніна сучаснага свету, але таксама пра яго заклік адчыніць дзверы свайго сэрца Хрысту, бо толькі тады чалавек зможа да канца пазнаць сябе і ісці шляхам збаўлення.

Помнік пакуль месціцца ў касцёле. Час і месца ўсталявання ў Маладзечне ўзгадняецца з мясцовымі ўладамі.

Аптымiст Зайчанка

Паводле планаў урада, інфляцыя ў Беларусі ў 2009 годзе чакаецца на ўзроўні 9–11 працэнтаў.

Такія лічбы на пасяджэнні Савета міністраў у Мінску агучыў міністр эканомікі Беларусі **Мікалай Зайчанка.**

"З улікам магчымага росту цэн на харчаванне, энергетыку мы будзем мець толькі імпартную інфляцыю 9%, плюс – нам трэба вырашаць і свае задачы", – растлумачыў міністр эканомікі зробленыя разлікі.

Нагадаем, што паводле прагнозу ў 2008 годзе цэны ў Беларусі павінны былі вырасці на 6–8%. Але прагноз прагнозам, а на справе выйшла паіншаму. Па выніках першага паўгоддзя 2008 года інфляцыя ў Беларусі дасягнула 7,3% і вырасла ў два разы ў параўнанні з аналагічным перыядам 2007 года (тады было 3,6%). Не выключана, што гадавая мяжа будзе пераадолена ўжо ў ліпені. Сярэднямесячная інфляцыя таксама павялічылася ўдвая (1,2% у студзені–чэрвені 2008 года супраць 0,6% годам раней).

У 2007 годзе інфляцыя ў нашай краіне склала 12,1%, а па прагнозе павінна была быць амаль у два разы ніжэй (6–8%). Гэта значыць, летась ураду не ўдалося ўтрымацца ў рамках прагнозу. Мяркуючы па ўсім, не атрымаецца і ў гэтым годзе.

Цяпер Уладзімір Юрчанка будзе губляць штомесяц 100 тысяч рублёў

Уладзіміра Юрчанку, старшыню Магілёўскай раённай Кастрычніцкай арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) знялі з пасады брыгадзіра вартаўнікоў будаўнічага ўпраўлення энергетыкаў "Лаўсанбуд".

Аб гэтым ён паведаміў аўтару BulletinOnline па тэлефоне.

– Да мяне на працу прыйшоў супрацоўнік міліцыі, які пачаў распавядаць майму начальніку, што ёсць непарадкі ў маёй працы, – кажа Уладзімір Юрчанка. – Нібыта праблемы тут і там, хаця нічога такога да гэтага моманту не было. Далей – больш. Ён прапанаваў кіраўніцтву мяне звольніць. Гэтае пытанне вырашалася некалькі дзён. Кіраўніцтва прыйшло да высновы – не звальняць, але зняць мяне з пасады брыгадзіра вартаўнікоў.

У выніку такога рашэння апазіцыянер будзе губляць прыблізна 100 тысяч рублёў ад свайго былога заробку штомесяц.

– Тое, што да мяне раптоўна прыйшоў супрацоўнік міліцыі і кіраўніцтва пасля яго прыходу мяне ледзь не звольніла, – гаворыць Уладзімір, – на маю думку, з'яўляецца вынікам маёй палітычнай дзейнасці.

Вітольд НЯЎРЫДА,
BulletinOnline.org

Эдуард Малафееў напіша мемуары?

Вядомы футбольны трэнер Эдуард Малафееў, які ў 1982 годзе прывёў мінскае "Дынама" да чэмпіёнства ў першынстве Саюза, не выключае, што на свет можа з'явіцца яго кніга.

– Я ўжо некалькі сшыткаў занатаваў, – прызнаўся Эдуард Васільевіч. – Запісваю свае думкі і роздумы аб жыцці, футболе, духоўнасці. Магчыма, і збяруся ўсё гэта выдаць. Можа быць, гэта і дапаможа каму-небудзь у жыцці. Я вось сёння гляджу на сучасны футбол, і мне робіцца млосна ад яго. Бо футбалісты не аддаюць футболу ўсю сваю душу, як гэта мы рабілі ў свой час, як вучыў я сваіх вучняў.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Эстонія дапамагае ЕГУ

Міністэрства замежных спраў Эстоніі прыняло рашэнне выдаткаваць 450 тысяч эстонскіх крон (прыкладна 45 тысяч долараў) працуючаму ў Вільнюсе Еўрапейскаму гуманітарнаму універсітэту, дзе навучаюцца ў тым ліку і тыя студэнты, якія па палітычных матывах былі адлічаны з беларускіх ВНУ

"Фінансаванне універсітэта – добрая магчымасць падтрымаць дэмакратычныя сілы, якія змагаюцца з апошняй дыктатурай у Еўропе, і даць моладзі магчымасць набыць вопыт навучання ў адкрытым грамадстве", – сказаў міністр замежных спраў Эстоніі Урмас Паэт.

ПОСОЛЬСКИЙ КЛУБ

«Тот факт, что на вашу газету «Народная воля» нельзя подписаться через систему «Белпочты» и она не продается в уличных киосках, считается недопустимым в моей стране»

С Чрезвычайным и Полномочным послом Нидерландов в Польше и по совместительству в Беларуси господином Марниксом КРОПОМ беседует главный редактор газеты "Народная воля" Иосиф СЕРЕДИЧ

Чрезвычайный и Полномочный посол Нидерландов в Польше и по совместительству в Беларуси господин Марникс КРОП во время посещения редакции газеты "Народная воля".

– Господин посол, мы рады приветствовать вас в Минске, но в очередной раз вы прибыли из Варшавы, где исполняете обязанности главы дипмиссии Нидерландов в Польше и по совместительству в Беларуси. Скажите, пожалуйста, есть ли перспективы открытия дипломатического офиса вашей страны непосредственно в Минске?

– Открытие любого посольства – дорогостоящее дело, для этого нужны веские основания. Что касается Беларуси, то за последние годы такие основания не появились, и на сегодняшний момент я не вижу возможности для их появления. Но никогда не знаешь, что может быть в будущем. Экономические связи между Беларусью и Нидерландами укрепляются. Голландские бизнесмены стали больше интересоваться вашей страной. И если в других областях, особенно политической, мы сможем создать более прочные двусторонние связи, то я уверен, что вопрос об открытии посольства станет актуальным.

Через три дня полиция получила первый звонок – сотрудник одного из банков на Юго-Востоке Лондона в районе Вулич сообщил, что к ним обратилась женщина с просьбой открыть счет. С собой она принесла 6000 фунтов наличными...

Женщину задержали. 32-летняя парикмахер Мишель Хог алиби на момент совершенного ограбления не имела, на вопросы детективов отвечала путано, толком не могла объяснить, откуда взялись эти 6000 фунтов. Ведь если судить по ее банковским счетам, сопоставляя приход с расходом, эти деньги оказываются неучтенными, "левыми"!..

Мишель Хог запуталась в своих показаниях, и в конце концов согласилась сотрудничать со следствием в обмен на обещание не привлекать ее к уголовной ответственности.

Очень скоро был найден тот самый белый грузовичок "Рено", в котором грабители вывезли 2 тонны фунтов стерлингов. В салоне брошенной машины полицейские нашли 1,3 миллиона фунтов, пистолет-автомат "Скорпион" и бронежилет. Еще через сутки в камере СИЗО оказались хозяин гаража Стюарт Райли, работник хранилища "Секьюритас" Эрмир Хайсенаж, кровельщик Лиа Руша и даже некий поэт-песенник Кейт Борер.

Жетмира Букпапу детективы Скотланд Ярда отыскали лишь через несколько месяцев в Марокко. В поисках остальных участников этого крупнейшего в истории Британии ограбления "пинкертоны" посетили Албанию, Испанию, Индию, Алжир. Удалось вернуть 21миллион фунтов стерлингов. Остальные 32миллиона исчезли вместе с грабителями Шоном Луптоном и Кейном Паттерсоном. Буквально на днях детективы Скотланд Ярда вернулись с Северного Кипра. У них была информация, что именно там скрывается Шон Луптон с 20 миллионами фунтов. Его вроде бы видели то в горной деревне неподалеку от Кариньи – столицы Северного Кипра, то в ночном клубе, то в казино. Поговаривают, Луптон "дружит" с двумя местными криминальными авторитетами, которые помогают ему скрываться от полиции и отмывать украденные миллионы...

Однако есть и другая информация о неуловимом Шоне. Его жена уверена, что супруг был убит подельниками еще в 2006 году, сразу после ограбления. Она уверена: будь муж жив – нашел бы возможность связаться с семьей. Однако вот уже 2 года ни она, ни родственники Шона ничего от него не получали.

Но у сыщиков из Скотланд Ярда свое мнение на этот счет. Они уверены, что Шон Луптон заручился поддержкой авторитетов международного криминального сообщества, которые помогают ему скрываться от правосудия и легализовывать украденные деньги.

Еще 12 миллионов числятся за неким Кейтом Паттерсоном, который, по информации Скотланд Ярда, скрывается в Западной Индии.

Все остальные участники налета на "Секьюритас" давно мотают срок в комфортабельных тюрьмах Великобритании. Говорят, теперь Жетмир Букпапа пытается писать мемуары, надеясь продать свою историю Голливуду и все-таки заработать свой миллион. Правда, это будет еще не скоро...

Евгений СУЛЫГА,
собкор "Народной воли"
в Великобритании.

Самые громкие ограбления последних лет

1. Центробанк Ирака в марте 2003 года. Был украден 1 миллиард долларов.

2. Дар Эс Салам банк, Ирак. Три охранника украли 300 миллионов долларов в июле 2007 года.

3. Ограбление хранилища наличных денег фирмы "Секьюритас Каш Мэнеджмент ЛТД Депо" в Англии. Похищено 53 миллиона 116 тысяч 760 фунтов стерлингов.

4. Центробанк Бразилии. Группа преступников 3 месяца рыла тоннель-подкоп из дома в здание Центробанка. Похищен 71 миллион 600 тысяч долларов.

5. "Северный банк", Белфаст, Северная Ирландия. 20 декабря 2004 года группа якобы боевиков ИРА, борющихся за независимость Северной Ирландии от Британской короны, похитила 26 миллионов 500 тысяч фунтов наличными.

Итоги встречи Союза Средиземноморья стали сенсацией

Николя Саркози (в центре) приветствует премьер-министра Израиля Эхуда Ольмерта (справа) и президента Палестины Махмуда Аббаса в Елисейском дворце.

Мир на Ближнем Востоке может наступить в ближайшее время, потому что лидеры Израиля и Палестины готовы заключить соглашение через полгода. Такие громкие заявления прозвучали под занавес саммита государств, которые входят в Союз Средиземноморья. Лидеры 43 стран-участниц собирались во французской столице на саммит. Своей основной задачей члены нового союза провозгласили обеспечение безопасности.

Государства, между которыми до сих пор отношения не складывались, теперь состоят в единой структуре. Так что налаживать связи им все-таки придется. И первые шаги в этом направлении уже сделаны.

Премьер-министр Израиля Эхуд Ольмерт после переговоров со своим палестинским коллегой Махмудом Аббасом сделал одно из самых громких заявлений всего парижского саммита, сообщает НТВ.

Эхуд Ольмерт, премьер-министр Израиля: "Между нами будут возникать определенные разногласия и проблемы, но мы никогда не были так близки к возможности договориться".

В Париже переговоры провели президенты Ливана и Сирии. Это событие политологи уже называют настоящим прорывом. Сирийский и ливанский лидеры не встречались уже многие годы, а теперь они готовы в ближайшее время возобновить полноценные дипломатические отношения и уже готовятся к взаимному открытию посольств в Дамаске и Бейруте.

Мишель Сулейман, президент Ливана: "Механизм уже есть. Я поеду в Дамаск, чтобы встретиться с президентом Асадом в Дамаске. А все детали будут оговорены после моего возвращения в Бейрут".

Все переговоры проведены при непосредственном участии французского президента. На родине его жестко критикуют именно за то, что внешней политике он уделяет значительно больше внимания, чем внешней. Но сам Саркози мыслит куда масштабнее и примеряет на себя роль регионального лидера.

А для Европы куда важнее сейчас экономические проблемы. Уровень производства в Евросоюзе снижается, падает экспорт, снижаются доходы. Хозяин саммита и президент Франции Николя Саркози с трудом сдерживал эмоции, говоря об экономических перспективах нового союза.

Николя Саркози, президент Франции: "Я не думаю, что стоит говорить о недостатке денег. Чего действительно не хватает, так это стабильности и мира. На юге Средиземноморья фантастический рынок, насчитывающий 272 миллиона потенциальных покупателей".

Хосни Мубарак (президент Египта) на это заметил, что еще одна из основных задач новой организации – это сокращение пропасти в уровне жизни между северными и южными странами Средиземноморья. Ведь иначе покупательная способность граждан более бедных из южных государств вряд ли оправдает ожидания Саркози.

А повышение уровня жизни сможет решить еще одну важную проблему – незаконную миграцию. Тысячи людей ежегодно нелегально проникают в ЕС. Так что экономические вопросы здесь связаны с вопросами безопасности. А ведь экономика и безопасность – два главных направления, на которых договорились работать члены Союза.

Павел ШИЛОВ.

Ингрид Бетанкур наградили орденом Почетного легиона

Власти Франции наградили Ингрид Бетанкур, находившуюся шесть лет в заложницах у колумбийских боевиков, орденом Почетного легиона.

Как сообщается, президент Франции Николя Саркози вручил награду Бетанкур на праздновании Дня взятия Бастилии, которое состоялось 14 июля на Елисейских полях. Орден Почетного легиона, учрежденный Наполеоном Бонапартом 19 мая 1802 года, – высшая награда Франции, присуждаемая президентом республики за военные или гражданские заслуги.

Напомним, что Ингрид Бетанкур, имеющая двойное колумбийско-французское гражданство, была похищена боевиками "Революционных вооруженных сил Колумбии" в феврале 2002 года, когда вела предвыборную кампанию за пост президента Колумбии. Она была освобождена 2 июля 2008 года в результате тщательно спланированной операции колумбийского спецназа.

После освобождения Ингрид Бетанкур прибыла во Францию, где прошла медицинское обследование. В ближайшем будущем она намерена вернуться в Колумбию.

Президента Судана обвинили в геноциде

Прокурор Международного уголовного суда в Гааге Луис Морено Окампо запросил ордер на арест президента Судана Омара Башира по обвинению в геноциде и совершении преступлений против человечности.

"Башир с помощью других лиц совершил акт геноцида против этнических групп фур, масалит и загава в Дарфуре (Судан) используя государственный аппарат, вооруженные силы и отряды военизированного движения Джанджавид", – говорится в официальном заявлении.

Согласно документам, находящимся в распоряжении суда в Гааге, подконтрольные Баширу силы несут ответственность за гибель 35 тысяч мирных жителей в Дарфуре.

Всего же число жертв действий администрации Башира в Дарфуре, по данным прокуратуры, может составлять до 265 тысяч человек.

Прокуратура также обвиняет Башира в убийствах, пытках, а также насильственном перемещении 2,9 млн человек.

Впервые прокурор Гаагского суда требует привлечь к уголовной ответственности действующего главу государства.

Би-Би-Си.

КОНКУРСЫ

Названа «Мисс Вселенная – 2008»

Первую премию на конкурсе красоты "Мисс Вселенная – 2008" завоевала 22-летняя брюнетка Дайана Мендоса из Венесуэлы. Помимо нее в финал конкурса попали еще три представительницы латиноамериканских государств, а также участница от России, 20-летняя москвичка, "Вице-Мисс Россия" Вера Красова. Не обошелся конкурс и без курьезных ситуаций.

В курортном городе Ньячанг во Вьетнаме проходил один из самых престижных конкурсов красоты "Мисс Вселенная – 2008", передает "Ассошиэйтед Пресс". За победу в конкурсе боролись представительницы 80 стран мира, однако в финале конкурса их число сократилось до 15 человек, из которых до финала дошли только пять участниц.

Победительницей признали 22-летнюю представительницу Венесуэлы Дайану Мендоса, которая получила корону из рук своей предшественницы, профессиональной японской балерины Рио Мори.

Не обошелся конкурс и без курьезных ситуаций. Так, представительница Украины, жительница Харькова, 19-летняя Элеонора Масалаб заболела ангиной всего за неделю до финала. А конкурсантка из Соединенных Штатов Кристл Стюарт во время показа вечерних платьев споткнулась о подол и упала. Впрочем, Кристл Стюарт быстро встала и невозмутимо продолжила идти по подиуму. Напомним, аналогичный случай произошел с ее предшественницей, американкой Рэйчел Смит, на конкурсе "Мисс Вселенная-2007", после чего девушка стала невольной звездой портала YouTube.

УРАЖАННІ

Колькі каштуе адпачынак у Крыме?

З года ў год самым даступным для беларусаў месцам адпачынку застаецца Крымскі паўвостраў. Колькі каштуе адпачынак у Крыме, наколькі адпавядаюць рэчаіснасці чуткі аб тым, што сітуацыя ў Крыме нестабільная, высвятляў карэспандэнт "Народнай волі".

Сім-карта з нулявым балансам – усяго за сорак долараў

Квіток на цягнік Мінск–Еўпаторыя я ўзяў на 24 чэрвеня. Кошт праезду ў плацкарце ў адзін бок каштаваў 110 тысяч рублёў.

Многія памятаюць, што за савецкім часам квіткі на цягнік ці самалёт у паўднёвым накірунку быў сапраўдным дэфіцытам. Людзі займалі чэргі з вечара, каб раніцай купіць квіток.

Зараз жа ніякага білетнага ажыятажу не назіралася. Квіток на цягнік можна было ўзяць бесперашкодна літаральна за тры дні да планаемай даты ад'езду.

Для таго каб не сапсаваць адпачынак, яшчэ не дабраўшыся да месца, неабходна ведаць некалькі простых правіл.

Першае. На мяжы з Украінай кожнаму пасажыру выдаецца міграцыйная картка. Тут вы павінны пазначыць свае асабістыя даныя і мэту вашага прыбыцця ва Украіну. Адну частку гэтай міграцыйнай карткі ўкраінскія памежнікі забіраюць, а другая – застаецца ў вас. Губляць яе, як вы разумееце, нельга ні ў якім выпадку. Калі вы страціце гэты дакумент, ёсць рызыка заплаціць штраф. Бо менавіта ў міграцыйнай картцы, а толькі затым у пашпарце, робіцца адзнака, што вы пакінулі краіну-суседку.

Другое. З тым каб не стаць ахвярай махляроў, не варта мяняць валюту на ўкраінскія грыўні ў дарозе. Іх лепей купіць яшчэ да ад'езду. Справа ў тым, што "мянялы", якія распачынаюць атакаваць пасажыраў "курортных" цягнікоў ужо на беларуска-ўкраінскай мяжы, прапануюць здаць валюту па заніжаным курсе. Так, за адзін амерыканскі долар прапаноўваюць усяго 4 грыўні 20 капеек. У Крыме курс вышэйшы – за долар даюць 4,5 грыўні, а за еўра – 7 грыўняў і 20 капеек. Да таго ж няма гарантыі, што ў цягніку вас не падмануць пры разліку.

Яшчэ адна пастка падпільноўвае пасажыраў, якія маюць жаданне прама ў цягніку набыць сім-карты ўкраінскіх аператараў, з тым каб патэлефанаваць родным і блізкім у Беларусь.

...У Харкаве ў вагон зайшоў "гарны хлопец-украінец" і з інтанацыяй Эдварда Радзінскага паведаміў: "Самыя танныя карткі для мабільных тэлефонаў тут! Званкі ў Беларусь ад 2 грыўняў, смс-паведамленні – 30 капеек. Кошт карткі ўсяго нічога – сорак долараў".

Знайшліся і такія, хто паверыў словам "агітатара", добраахвотна развітаўшыся з кроўнымі грашыма. Падман раскрыўся толькі тады, калі цягнік, набіраючы хуткасць, ад'ехаў ад харкаўскага перона і высветлілася, што на сім-карце, за якую былі ўплачаны немалыя грошы... нулявы баланс. Што называецца, скардзіцца пасля гэтага можна толькі на самога сябе.

І вось вы на месцы. Прама на вакзале мясцовыя жыхары дзякуюць вам за тое, што вы прыехалі менавіта ў Еўпаторыю, не падаўшыся на правакацыі. Справа ў тым, што напярэдадні кожнага курортнага сезона ў барацьбе за грошы расійскія тэлеканалы пачынаюць "інфармацыйную вайну" ў дачыненні да Крыма. Усё ж такі Крымскі паўвостраў – як-ніяк канкурэнт Сочы і іншых курортаў "саюзнай з Беларуссю дзяржавы".

Перад сваім ад'ездам асабіста бачыў рэпартаж, у якім расказвалася, што крымскія татары ледзьве не са зброяй атакуюць мясцовае насельніцтва. Як аказалася на практыцы, верыць такім чуткам не варта.

Грашовае пытанне

Тых, хто толькі збіраецца ў адпачынак у крымскім накірунку, безумоўна, цікавіць пытанне кошту жылля. Тут схема простая: чым бліжэй да мора вашы "апартаменты", тым даражэй прыйдзецца плаціць. Разлік тут ідзе за койка-месца ў суткі. Прычым жыллёвая палітыка ў Еўпаторыі кантралюецца гарадскімі ўладамі. Мясцовыя жыхары, якія жывуць па прынцыпе "лета зіму корміць", маюць права здаваць жыллё адпачываючым толькі згодна з устаноўленай уладамі сеткай. Такім чынам, кватэру з відам на мора можна зняць за 25–50 долараў у суткі. А самае таннае жыллё ў Еўпаторыі можна знайсці і за 5–7 долараў з чалавека ў суткі. Толькі ў гэтым выпадку хутчэй за ўсё вам прыйдзецца мыцца халоднай вадой і па патрэбе ісці, што называецца, на двор. Дарэчы, аддаленасць ад мора ў Крыме вызначае многае. Калі рэстаран стаіць на самым беразе мора, то вячэра з салаты з морапрадуктаў, шашлыка і бутэлечкі "Чорнага Мускатэля" вам абыдзецца ў 30–50 долараў.

Што да коштаў на прадукты харчавання ў Крыме, то яны нічым не адрозніваюцца ад мінскіх. Розніца толькі ва ўзроўні заробкаў. Заробак памерам у 700 грыўняў лічыцца ў Еўпаторыі завоблачным. У пераліку гэтая сума складае прыкладна 150 долараў. Таму мясцовыя жыхары ў асноўным робяць пакупкі на рынку. Тут можна набыць садавіну, гародніну і мяса танней, чым у гарадскіх крамах.

На рынку кілаграм курынага філе каштуе 37 грыўняў (у пераліку гэтая сума складае 8 долараў), кіло курыных кумпячкоў – 18 грыўняў (4 долары), кілаграм агуркоў – 4 грыўні, памідораў – 5 грыўняў (ледзь болей за долар). Што да садавіны, то сітуацыя з цэнамі наступная: кіло чарэшні – ад 8 да 15 грыўняў, вішні – 10 грыўняў, персікаў – 12–15 грыўняў.

Пабываць у Крыме і не пакаштаваць мясцовага віна – можаце лічыць, што адпачынак прайшоў дарма. У пытанні ўжывання алкаголю трэба быць асцярожным не толькі з-за эфекту, якое віно аказвае на арганізм пад уплывам сонечных промняў, але і ў пытанні якасці напояў. Тэзіс, што ўсё віно ў Крыме якаснае, не адпавядае рэчаіснасці. Разумныя людзі рэкамендуюць ужываць там віна гандлёвай маркі "Масандра". Кошт адной бутэлькі прыстойнага віна складае 7–10 долараў, усё, што танней, – збольшага сурагат.

Аддалі пляжы прыватнікам – атрымалі вынік

Але галоўныя славутасці Крыма – пякучае сонца, цёплае мора і гарачы пясок. Па развіцці інфраструктуры для адпачываючых Крым набліжаецца да той жа Балгарыі. Калі яшчэ некалькі гадоў таму пляжы па сутнасці былі дзікімі, то зараз цывілізацыя дайшла і туды. Напрыклад, кіраўніцтва Еўпаторыі пайшло простым, але плённым шляхам – дазволіла прыватнікам выкупіць "адзічэлыя" і непрыбраныя ад смецця пляжы. І сітуацыя палепшылася. Зараз, заплаціўшы ўсяго 5 грыўняў за квіток на пляж, вы можаце быць упэўнены, што яго рэгулярна прыбіраюць, прасейваючы пясок; што на пляжы ёсць прэсная вада, прыбіральні і раздзявальні; і, у рэшце рэшт, што камяні ў моры калі і ёсць, то няшмат. І месцы іх знаходжання пазначаны буямі – для вашай жа бяспекі. Акрамя таго, знаходзячыся ў моры, вы можаце быць спакойны, што патануць без вашай волі вам не дадуць. На беразе ў поўнай баявой гатоўнасці дзяжураць вопытныя выратавальнікі, у чым аўтар гэтых радкоў упэўніўся на ўласным вопыце. Справа ў тым, што плаваць я ўмею добра, уласныя сілы разлічваю, таму і заплываю, як правіла, далёка. Папярэджанне "За буйкі не заплываць!" часцяком ігнарую. Карацей, люблю купацца там, дзе нікога няма. Але выратавальнікі гэтага не ведалі. Пасля 25 хвілін купання далёка ад берага мяне насціг іх маторны кацер. "Падвезці?" – спыталі яны. "Дзякуй, сам даплыву". На тым і развіталіся.

...Увогуле, многія з тых, хто ездзіць у Крым штогод, заўважаюць, што Крым становіцца ўсё даражэйшым. Карацей, прыемнага вам адпачынку!

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Народная Воля <None>1http://www.nv-
18 ЛІПЕНЯ 2008 г.

КАДРЫ

В Молодежном театре эстрады новый директор

Василий Раинчик комментировать свой уход с руководящей должности отказался

"Народной воле" стало известно, что с должности директора Молодежного театра эстрады освобожден ***Василий Раинчик.***

Сейчас эту должность занимает бывший исполнительный продюсер продюсерского центра "Спамаш" **Николай Казюлин.** Представители центра отмечают, что это серьезное повышение – из продюсерского кресла пересесть в директорское. Тем более что директором театра его назначил министр культуры Беларуси **Владимир Матвейчук.**

"Очень лестно, что наших сотрудников назначают на такие должности, – поделилась PR-менеджер продюсерского центра "Спамаш" Юлия Полтавская. – *Нам как организации приятно, что мы куем такие востребованные кадры".*

По слухам, Василий Раинчик славился "нарушениями трудовой дисциплины", из-за чего его могли и уволить. Однако сам Раинчик, ссылаясь на занятость, комментировать свой уход с поста директора Молодежного театра эстрады отказался.

Валерия ЕСИНА.

Віцебскі фотажурналіст атрымаў міжнародны медаль

Віцебскі фотажурналіст Уладзімір Базан атрымаў медаль "За выбітнае майстэрства" на міжнародным фотаконкурсе "Вялікая эпоха".

Яго праца "Гульня ў шашкі" была высока ацэнена журы, у якое ўваходзілі прафесійныя фатографы, фотарэпарцёры і тэлевізійныя прадзюсеры з ЗША, Новай Зеландыі, Тайваня, Канады і Нямеччыны. Арганізатары фотаконкурсу выбіралі пераможцаў больш як з 13.500 прац, дасланых з 61 краіны.

"На гэты конкурс я даслаў свае працы, у якіх адлюстроўваецца рэчаіснасць у Беларусі праз жыццё простых людзей, – распавёў Уладзімір Базан. – *Відавочна, беларускія рэаліі падаліся цікавымі арганізатарам".*

Здымак "Гульня ў шашкі" зроблены ў працоўнай бытоўцы, дзе дзяўчынка гуляе ў шашкі з пажылым чалавекам.

НЕСКАРОНАЯ

Расказ пра жанчыну, якая шукае праўду

Кацярына Пятроўна Садоўская – чалавек выключнай сілы духу, цвёрдасці, унутранай годнасці і прастаты. Выпрабаванні не застрашылі яе, наадварот, прайшоўшы іх, яна адчула маральную перамогу. Паўгода правяла праваабаронца ў Гомельскай жаночай калоніі, асуджаная за абразу прэзідэнта па артыкуле 368 ч. 2 Ленінскім раённым судом г.Мінска. Яе змясцілі туды, не зважаючы на 60-гадовы ўзрост і захворванне... Яна і сёння спачувае чалавечым нядолям, паўстае за пакрыўджаных, па-мацярынску клапоціцца за блізкіх і далёкіх.

– Кацярына Пятроўна, мы ведаем вас як смелага праваабаронцу. Многія суперажывалі вашаму лёсу. Раскажыце крышачку пра сябе. Хто паўплываў на ваш светапогляд?

– Больш за іншых – мая бабуля Марыя Міхееўна. Яна жыла ў вёсцы Ровенская Слабада Рэчыцкага раёна і была шчырай верніцай. Бабулю з пяццю дзецьмі выгналі з дому як жонку ворага народа. Дзеда двойчы рэпрэсавалі, спачатку саслалі на Беламор-канал, а па вяртанні ў 1937 годзе зноў арыштавалі і расстралялі. Бабулю з дзецьмі прыгарнуў царкоўны стараста. За гэта паступіў тады загад разабраць царкву.

Улады склікалі вясковы сход і запатрабавалі, каб жыхары прагаласавалі за знос царквы. Адступнікам ад веры прапанавалі падарункі, хто першы падыме руку – таму падораць хустку ці кашулю. Адна жанчына падняла – і атрымала чорную хустку з кветкамі. Потым, праўда, у яе звіўся на галаве каўтун так, што яна да смерці не магла яго разблытаць. Храм разбурылі, а іконы людзі выратавалі ў хатах. Бабуля выратавала ікону Успення Божай Маці. Цяпер мы яе захоўваем як сямейную рэліквію.

У другі раз арыштавалі Марыю Міхееўну і старэйшага сына. Дочкі вырашылі яе ратаваць. Пятнаццацігадовай дзяўчынцы, (а маму нашу звалі Любоў), падказалі, каб яна прынесла перадачу, зайшла да сваёй маці ў камеру і памянялася з ёю адзеннем, бо непаўнагадовую трымаць не стануць. Так яны і зрабілі. Дзяўчынка пасядзела ў камеры, а потым задала рову, яе выпусцілі, а бабуля наша такім чынам была выратавана. Хутка пачалася вайна, рэпрэсіі трошкі сцішыліся. Бабуля ўсё жыццё дапамагала людзям, якія жылі побач.

– Калі вы пачалі выступаць за грамадзянскія правы?

– З Гомельшчыны ў маладосці я прыехала ў Мінск. Скончыўшы курсы, працавала ў трамвайна-тралейбусным упраўленні кіроўцай трамвая.

Мой муж Віктар Казіміравіч працаваў на заводзе. Ён быў дзетдомавец, бацька яго загінуў на фронце. Калі мы ўзялі шлюб і ў нас нарадзілася дачка, жыць усё роўна даводзілася ў інтэрнаце. Была нават спецыяльная пастанова, каб не пускаць мужоў на ноч у жаночы інтэрнат. Мы жылі ў страшнай цеснаце. Адны кіроўцы позна вярталіся са змены, іншым трэба было на змену рана ўставаць. Кіроўцы, народ прамы і рашучы, доўга не хацелі мірыцца з такім жыццём. Пачалі мы з дзяўчатамі лісты пісаць, каб насельніц інтэрната рассялілі, далі асобныя пакоі ці кватэры. Пісалі мы ў ЦК партыі, потым пачалі пісаць у Маскву ў Савет міністраў і самому Брэжневу, пісалі ў цэнтральныя газеты... Сталі да нас у інтэрнат камісія за камісіяй наведвацца. А потым прыехаў карэспандэнт з газеты "Знамя юности", каб разабрацца ў сітуацыі.

Мы яму расказалі, як у сушылку, на чорную лесвіцу хавалі мы мужоў, каб яны маглі больш з намі пабачыцца ды з дзецьмі пагуляць.

Кіраўніцтва інтэрната нават выселіць мяне хацела ды ў суд падало, але суд скаргу адхіліў і мяне з дачкой у інтэрнаце пакінуў. Потым хацелі з камсамола выключыць. Мае дзяўчаты гарой за мяне падняліся, ды самі былі гатовыя камсамольскія білеты на стол пакласці. Маўляў, не трэба нам такі камсамол, які не можа дапамагчы працоўнаму чалавеку атрымаць годнае жыллё.

Дыспетчар нашага трамвайнага ўпраўлення калі ўбачыў мяне, сказаў: "Дык вось ты якая, Кацярына, зусім яшчэ дзяўчынка! Цябе ж на ўсіх сходах узгадваюць, проста страшную бабішчу з рагамі намалявалі, а ты вунь, якая худзенькая. Малайчына! Можаш за сябе пастаяць!"

Пакуль наша начальства займалася валакітай, мы тым часам здолелі пабываць на прыёме ў ЦК КПСС і ў Прэзідыуме Вярхоўнага Савета СССР. Там нас супакоілі і сказалі: "Не хвалюйцеся, будзе вам жыллё".

Так мы пражылі тры гады, з 1967-га па 1970 год, а потым мне далі спачатку асобны пакой ад тралейбуснага ўпраўлення, а потым майму мужу прадаставілі асобную кватэру ад завода.

– Дзе вы потым набылі вопыт юрыдычнай і праваабарончай дзейнасці?

– Пяць гадоў працавала ў таварыскім судзе пад кіраўніцтвам вопытных суддзяў, вывучыла шмат юрыдычнай літаратуры. У сярэдзіне 90-х гадоў В.Каравайчык запрасіў мяне працаваць з партыяй "Здравый смысл". У 1996 годзе мяне абралі ў Камітэт па правах чалавека пры гэтай партыі.

У 1997 годзе мы вырашылі стварыць Лігу па абароне правоў чалавека.

Людзей да нас звярталася шмат. Да нас далучыліся "Беларуская асацыяцыя ахвяр палітычных рэпрэсій з 1917-га па 1950-я гады", якую ўзначальвала Кобец-Філімонава. Затым нам удалося зарэгістраваць у ЗША Міжнародную асацыяцыю па абароне правоў чалавека. Мы былі яе экспертамі. У звязцы Камітэт–Ліга–Асацыяцыя мы і працавалі.

Так працягвалася да 1999 года, пакуль партыі і нам не адмовілі ў рэгістрацыі.

Аднак у ЗША Міжнародная Асацыяцыя па абароне правоў чалавека існуе і зараз.

Кацярына Пятроўна захоўвае мноства газетных выразак, якія расказваюць пра грамадзянскія ініцыятывы і дзеянні праваабаронцаў.

"2001 год. Каля ста жанчын звярнуліся ў Адміністрацыю прэзідэнта, да Віктара Шэймана з патрабаваннем разабрацца ў некаторых грамадзянскіх справах. Жанчыны прыгразілі перакрыць праспект у раёне Адміністрацыі прэзідэнта".

"2001. Тры дзесяткі чалавек, якіх абараняе Міжнародная Асацыяцыя па абароне правоў чалавека, прыехалі да віцэ-спікера Палаты прадстаўнікоў Канаплёва, страціўшы надзею знайсці справядлівасць у мясцовых інстанцыях, звярнуліся ў парламент. Аднак Канаплёў у гэты час быў у камандзіроўцы, хадакам аказаў увагу загадчык упраўлення прыёму грамадзян".

"2001 год. Пікет разам з маладафронтаўцамі перад выбарамі".

"2002 год. Пікет перад Прадстаўніцтвам ААН у Беларусі".

– Вы дапамагалі многім людзям знайсці выхад з бяспраўя і галечы... Гэта былі толькі "палітычныя"?

– Вось Таццяна да 18 гадоў жыла ў дзіцячым доме ў Мінскай вобласці. Маці пазбавілі мацярынскіх правоў, у дзіцячым доме падрасталі яшчэ двое дзетак. Пазней аднаго хлопчыка і дзяўчынку ўсынавілі ў ЗША. Таццяна па выхадзе з дзіцячага дома мела права стаць у чаргу на атрыманне жылля. Аднак ёй стваралі перашкоды, не аддавалі пашпарт і іншае. Прыйшлося пахадзіць па інстанцыях і пацерабіць кіраўніцтва, каб дзяўчына змагла атрымаць кватэру.

Займалася я і справамі былых малалетніх вязняў. У Магілёўскай вобласці існавала, бадай, цэлая мафія. Вёўся гандаль пасведчаннямі былых вязняў. У катэгорыю вязняў патрапілі людзі, якія нарадзіліся ўжо пасля вайны, у 1946 годзе. Даведаўшыся пра дапамогу аўстрыйскага фонду, некаторыя ішлі на падман. На гэта іх вымушала цяжкае матэрыяльнае становішча. Тыя ж, хто сапраўды пакутаваў, згубілі сваю магчымасць карыстацца льготамі з-за няправільных дзеянняў органаў сацыяльнай абароны. Гэта крыўдзіла іх і наносіла раны, таму яны звярталіся да праваабаронцаў і юрыстаў.

– Што падтрымлівала ваш дух у калоніі?

– Людзі ставіліся да мяне паважліва. Гарнуліся жанчыны, якія шукалі справядлівасці і падтрымкі. Я атрымлівала шмат лістоў з Беларусі і з замежжа. Мне пісалі са Злучаных Штатаў, з Чэхіі, Польшчы, Францыі, Люксембурга. Раздражнёнае кіраўніцтва калоніі патрабавала: "Садоўская! Скажыце, каб вам пісалі па-руску. Садоўская, перастаньце агітаваць людзей!" А да мяне ўсё ішлі людзі. Яны мне і зараз пішуць з турмы.

– На зоне вы ўбачылі шмат несправядлівасцяў?

– Зняволеныя жанчыны працуюць на швейнай фабрыцы. Гэта унітарнае прадпрыемства, 51% даходаў якога належаць дзяржаве, а 49% – упраўленню калоніі. З 11 мільярдаў прыбытку 5 мільярдаў ідуць у кішэню турэмнай адміністрацыі. Са зняволеных жанчын вылічваюць за камунальныя паслугі, за харчаванне, плату за іскі, на руках застаюцца капейкі. Зняволеныя ў калоніі – як бяспраўныя рабы. Акрамя таго, мясцовыя кіраўнікі і дэпутаты бяруць вязняў на будаўніцтва катэджаў і леціішчаў. Прычыны, па якіх жанчыны аказваюцца за кратамі, часам зусім дробязныя. У Гомельскай калоніі сядзяць 60–70-гадовыя бабулькі за 5 макавых галовак.

– Няўжо гэта з'яўляецца злачынствам?

– Так. Уявіце сабе, бабулькі вырошчвалі невялікую колькасць маку на агародзе, каб выпякаць традыцыйныя кулічы па старых рэцэптах. А яшчэ парылі ногі ад прастуды.

Бабулька падзялілася з адной суседкай, а для другой не хапіла, вось тая і данесла ў адпаведныя органы. За гэта жанчыне далі 6 гадоў.

Іншай бабульцы 82 гады, а яна да гэтага часу – на зоне. Дочкі парогі абіваюць, паўсюль лісты пішуць, а маці апошнія гады ў турме праводзіць.

– Якой дапамогі, на вашу думку, яшчэ патрабуюць безабаронныя людзі?

– Па-першае, патрэбна матэрыяльная дапамога па выплаце штрафаў.

Патрабаванні па адміністрацыйных і некаторых грамадзянскіх справах яўна беспадстаўныя. Людзям цяжка іх панесці. Саракагадовую шматдзетную маці Галіну Адамовіч несправядліва пазбавілі бацькоўскіх правоў. З шасцярых дзяцей у яе аднялі траіх малодшых – 7-мі, 5-ці, 3-х год, дзеці знаходзіліся ў дзіцячым доме і захварэлі туберкулёзам.

Цяпер, каб вярнуць дзяцей, жанчына павінна выплаціць вялізную суму за іх утрыманне ў дзіцячым доме.

– У вас і ў самой нялёгкі лёс. Ваш муж Віктар Казіміравіч чакаў вас з турмы, змагаючыся з жыццёвымі нягодамі. І заўчасна сышоў з жыцця...

– Яго сэрца не вытрымала таго цяжару, які давялося перанесці. Гэта быў чалавек высокіх маральных прынцыпаў. Ён не цярпеў несправядлівасці і непрыстойнасцяў у чалавечых адносінах. У маладосці, калі ён служыў у Новасібірску і сутыкнуўся з бясчынствам і дрэннымі паводзінамі п'яных афіцэраў, падаў рапарт на звальненне. У Мінску Віктар Казіміравіч доўгі час працаваў на заводах імя Кірава і на "Электрамашы". У маладосці шмат займаўся спортам, хадзіў на стадыён з дзецьмі...

У сталым узросце яго адолеў дыябет, хадзіў ён на пратэзе, таму было асабліва цяжка. Без мяне яму давялося даглядаць за маёй паралізаванай маці. Гэта быў чалавек выключнай годнасці, апора і моцная абарона ў сям'і, мне яго вельмі не хапае.

Цяпер разам з маімі вернымі сяброўкамі і паплечніцамі мы імкнёмся абараніць тых людзей, якія церпяць крыўды ад улады.

Эла ДЗВІНСКАЯ.

Служи, солдат!

В понедельник начался очередной воинский призыв

Как сообщил на брифинге заместитель начальника главного организационно-мобилизационного управления (ГОМУ) Генерального штаба Вооруженных сил Беларуси **Сергей Куприк,** на срочную службу на должностях солдат и сержантов планируется направить около 10 тысяч граждан, на службу в резерве – 3 тысячи. Непосредственно в Вооруженные силы будет направлено около 7 тысяч новобранцев.

Особенностью данного призыва, по словам С.Куприка, является то, что впервые в соответствии с законодательством будет предоставлена отсрочка от призыва различным категориям граждан, а именно: выпускникам учреждений, обеспечивающих получение общего среднего, профессионально-технического и среднего специального образования, – до 1 сентября года окончания учреждения образования; гражданам, обучающимся в магистратуре, и аспирантам (докторантам) – на период обучения независимо от формы обучения (ранее – только очной формы обучения).

С.Куприк сообщил, что на сегодняшний день медицинское освидетельствование прошли более 72 тысяч призывников.

Вячеслав БУДКЕВИЧ.

Экспарт забаронены

Беларускі ўрад зацвердзіў пералік тавараў (у асноўным харчовых), у адносінах да якіх могуць быць устаноўлены часовыя абмежаванні або забарона на экспарт. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Савета міністраў ад 10 ліпеня 2008 года.

У пералік уключаны: мяса буйной рагатай жывёлы, свініна, бараніна або казляціна, малако і вяршкі (у тым ліку згушчаныя), амаль усе злакавыя, а таксама мука пшанічная або пшанічна-жытняя, крупы, мука грубага памолу і гранулы з зерня злакаў, зерне злакаў, апрацаванае іншымі спосабамі. У спіс таксама ўключаны соевыя бабы, насенне рапсу або кользы, сланечніка; алей соевы, сланечнікавы, рапсавы або гарчычны і іншае.

Як зазначаюць ва ўрадзе, "пералік харчовых і іншых тавараў, што экспартуюцца, дазволіць дакладна кантраляваць рэалізацыю гэтых тавараў і не дапусціць іх дэфіцыту на ўнутраным рынку".

Пры змене сітуацыі на ўнутраным рынку пералік можа быць дапоўнены або зменены.

Марына НОСАВА.

ЛИХИЕ СУДЬБЫ

Боевик Аль-Кайеды по имени Сергей

В испанской тюрьме остается белорус Андрей Мисюра, он же Сергей Малышев, он же Амин-аль-Ансари. Однако три года, отведенные на следствие, истекают, и материалы дела уже готовятся к передаче в суд. То есть очень скоро станет понятно, действительно ли тихий мальчик, выросший в скромной минской семье, стал одним из ключевых лиц в европейских подразделениях Аль-Кайеды.

"Химик" террористов с белорусским паспортом

Андрей Мисюра, также известный под именами Сергей Малышев и Амин аль-Ансари, был задержан 19 декабря 2005 года в Пальма-де-Майорка в ходе антитеррористической спецоперации "Единство", которую проводили правоохранительные органы Испании. В результате той операции, которая проходила одновременно во многих городах этой страны, была задержана группа исламистов, близких к знаменитой "Аль-Кайеде" и подозреваемых в вербовке и обучении боевиков и террористов-смертников. Также были задержаны два камикадзе, уже готовых к отправке в Ирак. В этой группе Мисюра числился специалистом по химическому оружию. По данным Министерства внутренних дел Испании, Мисюра проходил обучение и подготовку на территории Чечни, Азербайджана, Пакистана и Афганистана.

Всего было задержано 16 человек: восемь марокканцев и по одному гражданину Алжира, Беларуси, Египта, Франции, Ганы, Ирака, Саудовской Аравии и Испании.

Как отметил судья Национальной судебной коллегии Испании Фернандо Андреу, Андрей Мисюра, обращенный в ислам в 1998 году и принявший имя Амин-аль-Ансари, не имел постоянного места жительства. Он разъезжал по странам Европы, следуя указаниям руководства террористов и обучая на месте боевиков военному делу. В частности, в Испании он обучил 22-летнего террориста-смертника студента Усаму Агарби, который был готов к отправке в Ирак.

Руководил группой 25-летний уроженец Ирака Абу Суфиан, который, как считается, входил в ближайшее окружение одного из лидеров "Аль-Кайеды" Абу Мусаба аз-Заркави. Мисюра подчинялся лично ему, что свидетельствует о его особом статусе в террористической организации.

Как сообщил министр внутренних дел Испании Хосе Антонио Алонсо, Мисюра у террористов являлся специалистом по химическому оружию и давно разыскивался спецслужбами ряда стран Европы.

В списках значится

"Белорусский след в деле террористов", "Химик" Аль-Кайеды обучался в Минске", "Европейский транзит терроризма" – европейские газеты в те дни кричали подобными заголовками. Потому что террористы из Алжира, Марокко, Саудовской Аравии – это дело, в общем-то, обычное. Но чтобы белорус?!

Судебные органы Испании сразу же предупредили, что предъявленные задержанным обвинения являются предварительными и что согласно испанским законам расследование дела и, соответственно, предварительное заключение могут длиться до трех лет. Особо было оговорено, что все данные об Андрее Мисюре будут переданы белорусским властям.

Официальный Минск, прямо скажем, пребывал в шоке. Не было никаких оснований не доверять спецслужбам Испании, но и признавать, что белорусский хлопец подался в самую жестокую террористическую организацию, не хотелось. "Возможно, он только родился в Минске, а потом уехал", – как за спасительную соломинку хватался за предположения руководитель Центра информации и общественных связей КГБ Валерий Надточаев. И настойчиво повторял, что по линии Интерпола никакой гражданин Беларуси Андрей Мисюра не разыскивался. В этом, кстати, ничего удивительного нет: спецслужбы Европы знали его как Амина-аль-Ансари, никто и предположить не мог, что этот бородатый изможденный человек – самых что ни на есть славянских и православных кровей, это выяснилось только при задержании.

Наконец официальная информация из КГБ появилась: "Задержанный правоохранительными органами Испании уроженец Минска Мисюра Андрей Алексеевич (дата рождения – январь 1975 года) действительно проходит по учетам граждан Республики Беларусь, однако с 1999 года на территории страны постоянно не проживал. По данным КГБ, в 2004–2005 годах по линии Интерпола поступали сведения о задержании Андрея Мисюры за незаконное нахождение на территории Германии, Италии и Португалии. Вместе с тем какой-либо официальной информации о розыске этого гражданина за совершение преступлений в правоохранительные органы Республики Беларусь не поступало".

Белорусская сторона настойчиво делала акцент на том, что Мисюру в Беларуси не ловили, потому что его никто не искал, вот по какой причине: разыскиваемый в Европе террорист приезжал в Минск и, судя по всему, в одну из последних поездок сделал себе паспорт на имя Сергея Малышева, с которым и попался.

Офицер запаса

От Андрея Мисюры поспешило открыться и белорусское Министерство обороны, распространив пресс-релиз, из которого следовало, что ни Андрей Мисюра, ни Сергей Малышев в кадровом составе Вооруженных сил Беларуси не числятся и не числились ранее.

Вместе с тем "своего" в Мисюре опознали одногруппники по географическому факультету Белгосуниверситета, на военной кафедре которого он проходил обучение как раз по специальности "химические войска". Мисюра в Беларуси является офицером запаса.

Опознали Мисюру и в одной из исламских общин Минска. Вопреки сообщениям европейских газет о том, что Мисюра принял ислам в Пакистане, здесь говорят, что он действительно пришел к исламу в зрелом возрасте, но еще в Беларуси. То ли общение с иностранными студентами к этому подтолкнуло, то ли телевизионные трансляции о "геройствах" Аль-Кайеды, то ли какое-то особое осмысление мира и своего места в нем... Есть свидетельства, что еще в Беларуси Мисюра считался человеком достаточно радикальных взглядов, одержимо настроенным на борьбу за веру. Но потом из минской общины Андрей просто исчез...

Это, впрочем, не помешало белорусскому КГБ провести обыски на квартирах членов общины под предлогом их возможной причастности к взрывам в Витебске (по крайней мере, так утверждала газета "Труд"). Поскольку "авторы" витебских взрывов так и не найдены, надо понимать, в этом смысле у минских единоверцев Мисюры все оказалось чисто. Однако белорусские официальные лица уже входили в раж, пытаясь доказать, что с доморощенными террористами мы будем бороться жесточайшим образом. Так, председатель Комиссии по международным делам и национальной безопасности Совета Республики Национального собрания Беларуси Николай Чергинец заявил, что белорусская сторона будет "настаивать на беспрекословной выдаче задержанного белоруса". По словам Чергинца, на родине белорусского террориста ожидает немалый тюремный срок – от 25 лет до пожизненного. Впрочем, между Беларусью и Испанией не заключено двустороннее соглашение о выдаче преступников, потому надежде Минска провести образцово-показательный процесс сбыться, видимо, не суждено.

Тем временем в Испании дело уже близится к суду. Утечек информации в прессу очень мало, но кое-что о группировке уже известно.

Среди задержанных оказались три радикальных имама и предполагаемый главарь этой организации, иракец Хийяг Маан, известный по кличке Абу Суфийян. У задержанных оказалось большое количество химических веществ, пригодных для изготовления взрывчатки. Но специалист в этом деле был один – Мисюра, именно он отлично смешивал взрывные вещества из подручных компонентов.

"Присутствие среди арестованных выходца из Беларуси, эксперта по химическому оружию, стало самым тревожным фактом, выявленным испанской полицией при задержании большой группы исламистов", – констатировало МВД Испании. Видимо, подразумевалось, что угрозы с этой стороны в Европе никак не ждали.

Агенты полиции установили, что исламисты занималась в основном тремя "направлениями" – вербовкой молодежи, продажей наркотиков и подделкой документов. Испанские газеты рассказывают, что в 1998 году Мисюра установил контакт с исламским террористом Абу Суфианом, который оценил уровень образования белоруса и сделал его своим доверенным лицом. Испанские спецслужбы располагают данными, что Мисюра воевал за Аль-Кайеду в Пакистане и Азербайджане, что он получил военное образование в Чечне, а религиозное – в Пакистане. В Европе у него не было постоянного места жительства, он кочевал из страны по "служебным командировкам", следуя указаниям главарей аль-кайедской группировки. Во время поездок он якобы обучал на месте боевиков военному ремеслу.

Главное управление полиции Испании заявило, что в близкой к "Аль-Кайеде" разгромленной террористической ячейке Малышев подчинялся непосредственно ее главарю, иракцу Абу Суфиану, входившему в ближайшее окружение "террориста номер 2" (первый, как известно, Усама бен Ладен) Абу Мусаба аль-Заркауи.

"Группа боевиков была подготовлена для отправки в районы боевых действий. Что касается отравляющих веществ, то террористу не хватило лишь нескольких химических компонентов для завершения работы над ними", – заявил министр внутренних дел Испании Хосе Антонио Алонсо.

Связь с данным номером отсутствует

Звоню по минскому телефонному номеру родителей Андрея. Судя по всему, больших денег от сына они не получали, поскольку живут в обычном спальном районе. "Здравствуйте, – я представляюсь. – Хотела бы с вами встретиться и узнать, есть ли какие-либо новости о вашем сыне".

Женщина на том конце провода, не говоря ни слова, положила трубку...

Ирина МАЛЬЦЕВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
18 ЛІПЕНЯ 2008 г.

У наступным годзе плануецца павялічыць саюзнае фінансаванне «Славянскага базару»

Павел Барадзін прапанаваў зрабіць Віцебск сталіцай Саюзнай дзяржавы.

Тлумачачы сваю прапанову, П.Барадзін падкрэсліў, што фестываль робіць значны ўнёсак у працэс яднання Беларусі і Расіі. Паводле яго слоў, невыпадкова на яго правядзенне з бюджэту Саюзнай дзяржавы штогод выдзяляецца прыблізна мільён долараў.

Але дзяржсакратар адзначыў, што аб'ём фінансавання трэба перагледзець, бо гэта сума не мянялася на працягу апошніх пяці гадоў. Ён прызнаў, што гэтых грошай яўна недастаткова, і ўжо ў наступным годзе плануецца істотна павялічыць саюзнае фінансаванне "Славянскага базару ў Віцебску".

БЛІЦ

Як вы праводзіце свой адпачынак?

"Народная воля" пацікавілася, дзе, як і за сколькі адпачываюць знакамітыя людзі Беларусі.

Алег АНТОНЕНКА, былы капітан нацыянальнай зборнай Беларусі па хакеі:

– Першую частку водпуску мы з сям'ёй правялі ў Турцыі. Потым паехалі на Днепр у Гомельскую вобласць, дзе адпачывалі "па-дзікаму" – з намётамі, з рыбалкай... Патрацілі на ўсё гэта каля пяці тысяч долараў.

Ігар ВАРАШКЕВІЧ, лідэр гурта "Крама":

– Патрапіў нядаўна на пару дзён на хутар Вайцюшкевіча на Нёмане... Я бы з задавальненнем з'ездзіў куды-небудзь на пару тыдняў, але наўрад ці атрымаецца. З радасцю з'ехаў бы на ўсё лета з горада – мне тут няўтульна.

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК, паэт:

– Адпачынак – не беларускае паняцце, бо мы прывыклі працаваць. У такім духу я і выхаваны – калі я нешта раблю, то адпачываю. А калі мне за тое, што я раблю, яшчэ і плацяць грошы, так гэта самы лепшы адпачынак! Ехаць у нейкую Турцыю, задраўшы ногі ляжаць на гарачым пяску – гэта ціхае вар'яцтва.

Уладзімір АРЛОЎ, пісьменнік:

– Збіраюся на тыдзень ад'ехаць у родны Полацк, каб падзарадзіцца ад той зямлі, дзе я калісьці бегаў босенькі. Я ўжо мару пра тое, як буду плаваць у маім родным возеры Люхаве, як буду плыць у лодцы сярод белых лілеяў, як мяне сустрэне парачка знаёмых чапляў...

Не хачу сказаць, што я не люблю далёкіх краёў – пабываў у 30 краінах. Прывёз, дарэчы, з усіх адпачынкаў перакананне, што нашы жанчыны –найлепшыя і найпрыгажэйшыя ў свеце. Безумоўна, мяне вабіць і цёплае мора, хацелася б трапіць у Рым... Але бліжэйшыя планы – ліпень у Полацку.

Святлана ЗЕЛЯНКОЎСКАЯ, актрыса:

– Водпуск у мяне яшчэ толькі будзе. Куды паеду – сакрэт. Грошай на водпуск траціць не збіраюся наогул. Мужчына павінен траціць. Правільна? Так што я не ведаю, колькі гэта будзе каштаваць.

Альберт СКАРАХОД, спявак і кампазітар:

– Кожны год я абавязкова выкройваю 10–12 дзён на водпуск, каб зарадзіцца энергіяй на наступны год. Часцей за ўсё ад'язджаю ў звыклыя нам паўднёвыя краіны. Я не прывык шыкаваць, не планую наведваць нейкія экзатычныя курорты. Я чалавек больш прыземлены і просты. Мне падабаецца Крым, а ён не надта дарагі.

Дзіко Маймуна АМАДУ, канцэртмайстар Прэзідэнцкага аркестра Беларусі:

– Не ведаю, куды канкрэтна паеду ў адпачынак, але абавязкова на мора. Люблю адпачываць ля вады. Думаю выдаткаваць каля тысячы долараў на гэта.

Ірына НАРБЕКАВА, актрыса:

– Я зараз праводжу свой адпачынак у піянерскім лагеры "Гарызонт" у Радашковічах, дзе працую кіраўніком тэатральнага гуртка. У жніўні лячу ў Турцыю. Пуцёўка каштуе 1000 долараў. Хачу прайсці там аздараўленчы масаж, якія-небудзь сувеніры набыць... Думаю, спатрэбіцца на ўсё тысячы паўтары. Я добра папрацавала і зараз жадаю вельмі добра адпачыць.

ЭКСПЕРТЫЗА

Наталля МІХАЙЛАВА:

«Галоўнае – не злоўжываць спіртным на адпачынку»

Намеснік дырэктара турыстычнага агенцтва "Смалянка" ***Наталля Міхайлава*** *падзялілася парадамі для тых, хто едзе ў адпачынак: колькі грошай з сабой браць, што не забыць пакласці ў чамадан і для чаго патрэбна страхоўка.*

Якой таўшчыні павінен быць кашалёк

Можна ўзяць і 100 долараў з сабой на два тыдні адпачынку, але тады прыйдзецца шмат у чым сабе адмовіць. *"Калі чалавек хоча наведваць экскурсіі (а каштуюць яны ва ўсіх краінах прыкладна аднолькава), трэба долараў 150–200 на аднаго чалавека,* – гаворыць Наталля Міхайлава. – *Колькі спатрэбіцца на харчаванне – залежыць ад краіны. Калі едзеце ў Турцыю, то гэта сістэма "Усё ўключана". Калі адпраўляецеся ў еўрапейскія краіны, то спатрэбіцца каля 50 долараў у суткі на чалавека".*

Не забудзьце пілку для пазногцяў і світэр

Нават калі едзеце адпачываць улетку, у вашым чамадане павінна быць хаця б адна цёплая рэч. Калі вы аддаяце перавагу восеньскаму сезону, то лёгкіх і цёплых рэчаў павінна быць пароўну.

"Шмат залежыць ад краіны і гатэля, – тлумачыць Наталля Міхайлава. – *Калі вы спыніліся ў еўрапейскім пяцізоркавым гатэлі, то будзьце гатовы да таго, што да вячэры прыйдзецца апрануцца адпаведна".*

Не забывайце звыклыя дробязі. *"Я сутыкнулася з праблемай пошуку пілкі для пазногцяў,* – усміхаецца Наталля Міхайлава. – *Заўсёды яе забываю, і ні ў адным, нават пяцізоркавым гатэлі не магла яе знайсці".*

Лячыць вас ніхто не будзе

Вялізную аптэчку цягнуць з сабою не трэба. Калі адбудзецца нешта сур'ёзнае, то не за аптэчку з анальгінам хапацца трэба, а за страхавы поліс. *"Калі чалавек хворы на сэрца, то трэба ўзяць з сабой валакардзін, таму што спецыяльныя лекі не заўсёды бываюць у курортных аптэках,* – гаворыць Наталля Міхайлава. – *Для ўсіх астатніх выпадкаў існуе страхоўка".*

Аднак не спадзявайцеся, што разам з адпачынкам па страхоўцы і падлечыцеся. Страхоўка пакрывае толькі вострыя памежныя станы, няшчасныя выпадкі.

"Дама здавала ў багаж..."

Калі вы жадаеце з сабою на адпачынак узяць хатняга любімца, то рыхтуйцеся да сур'ёзных выдаткаў. *"Гэта вельмі складаны працэс: неабходна аформіць масу дакументаў пры вывазе, плюс столькі ж папер пры ўвозе гадаванца ў іншую краіну,* – тлумачыць Наталля Міхайлава. – *Тая ж працэдура з вяртаннем. Галоўнае – гэта вельмі дорага. І не кожны гатэль прымае жывёл".*

Будзьце ўважлівы!

За мяжой, асабліва ў азіяцкіх краінах, трэба асцярожна ставіцца да экзатычных страў. На спецыфічную кухню могуць быць нетыповыя рэакцыі арганізма. Асцярожнасць не перашкодзіць і ў папулярных на курортах аквапарках – яны займаюць першае месца па траўматызме на адпачынку.

"Галоўнае – не злоўжываць спіртным на адпачынку, – звяртае ўвагу Наталля Міхайлава. – *Страхоўка дзейнічае толькі тады, калі чалавек быў не ў стане алкагольнага ап'янення. Калі аналізы пакажуць нават мінімальную колькасць спіртнога ў арганізме, то якую б шкоду чалавек ні панёс, яму ніхто іх не пакрые".*

Вольга ПРУДНІКАВА.

МУЗЫКАЛЬНЫЙ ЛІКБЕЗ

Елена ЖУКОВА:

«У нас в стране очень многое идет наперекосяк оттого, что большинство людей занимаются не своим делом»

Елена Жукова в свои 24 – журналист, организатор концертов и фестивалей, посвященных андеграундной музыке, PR-менеджер белорусских групп. "Народная воля" попыталась пролить свет на всю ее профессиональную многогранность.

– Сегодня можно сказать, что в области работы с музыкантами ты - мастер на все руки. А что было твоим первым детищем?

– Сайт "Lost Principality", просуществовавший 2–3 года. Он был концептуальным: раздел, посвященный языческой музыке назывался "Капище", готической - "Костел", фотораздел - "Заколдованное озеро"... Мне очень хотелось, чтобы проект был локально привязан к Беларуси, но единомышленников было найти сложно, поэтому проект вышел интернациональным: писали авторы из России, Молдавии, Украины.

– Как вообще возник твой профессиональный интерес к андеграунду?

– У нас в стране очень многое идет наперекосяк оттого, что большинство людей занимаются не своим делом. А профессионалы слишком себя уважают, чтобы на голом энтузиазме занимаются чем-то стоящим, но абсолютно непопулярным. Из юношеского максимализма хотелось это как-то изменить. Я училась на журфаке и очень хотела свои знания и умения направить в русло развития андеграундной белорусской культуры.

– Чем занимаешься сейчас?

– С Натальей Кирюшиной в рамках "VeDa promo group" делаем концерты и фестивали. Изначально они были более "тяжелыми", теперь стараемся уйти в фольковую культуру, состоявшуюся и более доступную. Если посмотреть на ситуацию в мире, можно увидеть, что сейчас фольк-, этно-коллективы безумно популярны. Это логично, когда люди любят музыку, которая созвучна их генетической памяти.

– Вас интересует музыка только с белорусскоязычным вокалом?

– Мы не будем заниматься всякой группой, которая поет по-белорусски. Мы ищем хорошие группы независимо от языка исполнения, но если он все же белорусский, мне как гражданину этой страны вдвойне приятно заниматься ими.

– Не кажется, что очень много белорусских групп так и не стали известными лишь потому, что их участники посчитали, что это бесперспективно?

– Большинство молодых музыкантов – либо студенты, либо недавние выпускники вузов. И здесь им предстоит сделать непростой выбор: либо достигать каких-то профессиональных результатов, либо посвятить себя музыке, которая совершенно не гарантирует прибыли.

Пиаром групп в нашей стране заниматься очень сложно. Дело даже не в том, что нет профессиональных продюсеров, пресс-аташе, PR-менеджеров. Они есть, но уходят в маломальски денежную поп-музыку...

– Если все так сложно, зачем лично тебе это надо?

– Моя цель – не заработать на ком-то, а расшевелить музыкантов. Мне хочется свои умения дипломированного специалиста по связям с общественностью применить на благо музыкантов. Вот такая патриотическая романтика *(улыбается).*

– Не возникало желания из-за малой перспективности бросить это занятие?

– Думаю, я еще многого не сделала. И не разделяю общего пессимизма, дескать, белорусская музыка приходит в упадок. Если ничего эпохального не предлагают старые рок-звезды, то молодые коллективы радуют смешением стилей и прочими музыкальными поисками. У нас сейчас практически в каждом стиле появилось хотя бы по пять достойных групп. И я не сомневаюсь, что в ближайшее время количество перейдет в качество.

– Приходилось сталкиваться с заведомо неприязненным отношением к белорусским коллективам?

– Да, и неоднократно. Думаю, это обусловлено белорусской ментальностью. Некоторые люди проецируют свои собственные комплексы и несостоятельность на всю страну. Убедить людей просто прийти и послушать белорусский коллектив практически невозможно. Почему-то очень многие думают, что белорусы не умеют играть... Самое сложное – втолковать людям, что в Беларуси много хорошей музыки, литературы, театральных постановок, которые ценятся за границей. А то, что национальное достояние должно цениться в своей стране, – само собой разумеется!

– Не секрет, что взрослые люди не всегда адекватно реагируют на тяжелую музыку, тем более если ее слушают их дети...

– Однажды мы проводили фестиваль в Молодежном театре эстрады. Когда утверждали афишу, нам посоветовали развесить ее в ПТУ. Тогдашнее начальство было просто уверено, что весь наш контингент – исключительно из училищ. Каково же было их удивление, когда выяснилось, что это студенты, аспиранты и даже преподаватели вузов. Неадекватное отношение старшего поколения к андеграунду обусловлено тем, что 20 лет назад рупорами тяжелой и рок-музыки в целом были асоциальные маргинальные элементы. Сейчас ситуация изменилась. Нынешние рокеры – это на 90 процентов прогрессивная и образованная молодежь.

Если ваши дети ходят на концерты или даже сами играют такую музыку, не нужно бояться и думать, что это обязательно сопряжено с каким-то негативом. Любое увлечение развивает личность, а если оно еще и в некотором смысле подрывает какие-то общественные устои или бросает им вызов, то личность закаляется.

Анна ИВИНА.

Беларускі тэатр атрымаў Гран-пры фестывалю "Мельпамена Таўрыі"

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі атрымаў Гран-пры X Міжнароднага тэатральнага фэсту "Мельпамена Таўрыі".

Беларускі тэатр паставіў спектакль "Жанчыны Бергмана" Мікалая Рудкоўскага на сцэне Херсонскага абласнога акадэмічнага музычна-драматычнага тэатра. Апроч галоўнай узнагароды фэсту, тэатру быў уручаны дыплом за лепшую пастаноўку ад незалежнага журналісцкага журы.

Парад нявест пройдзе ў Брэсце

26 ліпеня ў Брэсце, напярэдадні Дня горада, упершыню адбудзецца парад нявест.

Для правядзення брэсцкага параду да арганізатара – фотавідэастудыі "Папарацы" – ужо далучыліся салоны вясельнай моды, цырульні, супрацоўнікі школы прыгажосці Цэнтра маладзёжнай творчасці, фларысты.

Гераінь свята чакае трохгадзіннае шоу з дэфіле, конкурснай праграмай, катаннем на ўпрыгожанай кветкамі карэце, запрэжанай парай коней, фота- і відэасесіямі і шампанскім з вялікім тортам.

Усе канцэрты фестывалю «Be Free» будуць бясплатнымі

У фестывалі ***"Be Free",*** *які пройдзе ў Львове 9 і 10 жніўня, возьмуць удзел 26 гуртоў з Беларусі, Украіны, Польшчы і Францыі. Для гледачоў усе канцэрты будуць бясплатнымі. Для начлегу публікі ўлады Львова выдзяляюць месца пад намётавы гарадок.*

Па словах аднаго з арганізатараў, журналісткі Марыі Садоўскай, праграма фестывалю ўжо складзена на 90 працэнтаў. Возьмуць удзел такія знакамітыя беларускія гурты, як **"Крама", "НейраДзюбель", "Стары Ольса", "IQ-48", "ULIS"** і іншыя. Акрамя таго, запрошаны спецыяльныя госці – **"Тартак"** (Украіна)", **"T.Love"** (Польшча).

"Свабода непарыўна звязана з маладзёжнай музыкай і культурай, – тлумачыць ідэю фестывалю, прадстаўляючы лэйбл BMAgroup, **Віталь Супрановіч.** - *Моладзь сама выбірае, што, дзе і калі ёй слухаць, а музыканты павінны мець мажлівасць выступаць перад самай рознай публікай".*

Слоган фестывалю гэтага года – "Be Free" ("Будзь вольны" - адлюстроўвае галоўную каштоўнасць мерапрыемства – яго адкрытасць і нефармальнасць.

Львоў выбраны месцам фестывалю невыпадкова: у гэты вядомы культурнай і гістарычнай спадчынай горад штогод прыязджаюць турысты з розных краін Еўропы. Важна, што для вандроўкі ва Украіну не патрэбна віза, а дарога Мінск–Львоў па кішэні нават студэнту.

"Я вельмі рады, што мне давядзецца выступаць менавіта ў Львове, – ухваляе выбар горада **Зміцер Вайцюшкевіч.** – *Гэта адзін з маіх самых любімых украінскіх гарадоў. Думаю, з гэтага атрымаецца вельмі пазітыўная рэч. Фэст дасць магчымасць інтэграцыі ўкраінскай, польскай, беларускай музыкі, інтэграцыі музыкаў і слухачоў".*

Валерыя ЕСІНА.

Ханс-Ёхан ШМІДТ:

«Я абрадаваўся магчымасці пазнаёміцца з прадстаўнікамі беларускай грамадскасці»

Днямі офіс АБСЕ ў Мінску арганізаваў чарговую мастацкую акцыю – літаратурна-паэтычны вечар у Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры.

У праграму вечара ўвайшлі арыі з опер, рускія і беларускія народныя песні ў выкананні лаўрэатаў міжнародных конкурсаў **Эльвіры Рыжанавай** (сапрана) і **Міхаіла Пузанава** (тэнар), а таксама лірычная паэзія ў выкананні праваабаронцы і паэта **Веры Страмкоўскай.**

"Некаторыя лічаць, што мастацкія акцыі выходзяць за рамкі дзейнасці дыпламатычнага прадстаўніцтва, – адзначыў кіраўнік офіса АБСЕ ў Мінску пасол Ханс-Ёхан Шмідт. – *Калі я прыехаў у Мінск і ўбачыў пустыя сцены офіса, я падумаў, што іх неабходна ўпрыгожыць карцінамі беларускіх мастакоў. А пасля адкрыцця выставы гэтых палотнаў спадарыня Страмкоўская прапанавала арганізаваць наступны вечар з удзелам айчынных музыкантаў і спевакоў. Я абрадаваўся такой магчымасці пазнаёміцца з прадстаўнікамі беларускай грамадскасці".*

Напрыканцы вечара яго вядучая Вера Страмкоўская выказала падзяку спадару Хансу-Ёхану Шмідту за падтрымку беларускай культуры і грамадзянскай супольнасці краіны.

Валерыя ЕСІНА.

Олег Газманов разъезжает по Витебску на велосипеде

"Я очень подвижный человек, и мне тяжело долго находиться без движения, – пояснил Газманов. – *К тому же в Витебске чистый воздух, хорошие дороги и вежливые водители, кататься – одно удовольствие".*

Велосипед артист купил в Витебске. Однако забирать его с собой в Москву не собирается. Олег Газманов подарил велосипед витебскому танцевальному коллективу "Зорька", который принимает участие в программах Газманова на "Славянском базаре". Подарок был вручен ансамблю с двумя условиями: Газманов будет на нем кататься все время пребывания в Витебске, и в следующий приезд артиста в Витебск "Зорька" вновь будет танцевать на сцене под его песни.

Дмитрий Колдун еще не решил – за Россию или за Беларусь

Колдун собирается пойти по стопам Димы Билана и планирует вторично принять участие в "Евровидении" и победить.

"В этом году я не ездил на "Евровидение", так как два года подряд нет смысла это делать, – говорит певец. – *Но в следующем году обязательно снова поеду на этот конкурс. Еще только не решил, за кого буду выступать – за Россию или за Беларусь. Дело в том, что от России сложно поехать, но легче победить. А от Беларуси поехать легче, но сложнее победить".*

Загінуў пісьменнік Браніслаў Спрынчан

У Мінску пад коламі аўтамабіля загінуў пісьменнік Браніслаў Спрынчан.

"Гэта адбылося ўвечары на праспекце Пераможцаў. П'яны кіроўца, 1962 года нараджэння, здзейсніў наезд на пешахода, пенсіянера 79 гадоў, які пераходзіў дарогу па рэгуляваным пешаходным пераходзе на чырвонае святло, – паведаміў інспектар аддзела прапаганды і агітацыі сталічнага ДАІ **Аляксандр Гузаў.** – *У выніку пенсіянер ад атрыманых траўм памёр на месцы".*

Высветлілася, што ўтрыманне алкаголю ў крыві кіроўцы было на ўзроўні 3,56 праміле. Мікалай Чаргінец, кіраўнік афіцыйнага Саюза пісьменнікаў, паведаміў, што ўжо распачата крымінальная справа.

Пахаваны Браніслаў Спрынчан на Паўночных могілках у Мінску.

ВЕРШАВАНЫЯ ФЕЛЬЕТОНЫ

Недарэчнасці, глупствы, бюракратызм, кур'ёзы – усё, што адбываецца ў беларускім грамадстве, знайшло адлюстраванне ў кнізе Алеся Няўвеся "Дзежка дзёгцю", якая выйшла нядаўна ў свет.

З некаторымі вершаванымі фельетонамі А.Няўвеся "Народная воля" вырашыла пазнаёміць сваіх чытачоў.

Алесь НЯЎВЕСЬ

Ад аўтара

Я – Алесь.
І звестак, пэўна, хопіць.
Ну, магу дадаць:
Люблю хаўрус.
Не дзядок.
Аднак ужо й не хлопец.
Беспартыйны.
Шчыры беларус.
Я – Алесь,
Хто праўду-матку рэжа.
Я – Алесь,
Не "экстрэміст" Мірон.
Ён сцягі развешвае на вежах,
Мой жа "сцяг" –
Бяскрыўдны фельетон...

Як звяры дзялілі шкуру незабітага мядзведзя

Лясное царства –
Нібы на хаўтурах,
І зрэдку,
Голас чуецца ледзь-ледзь,
Бо ў лесе –
Тыранія-дыктатура,
"Пад пяткаю"
Трымае ўсіх мядзведзь.
Каму па карку трэсне
Мімаходам,
Каму "ўпулюе"
Насаком пад зад,
Каго аблашчыць –
Дасць калоду мёду,
Каго надзеліць
Лепшаю з пасад.
І спакваля
Наспела ў лесе змова,
Пратэст,
Як прышчык,
Выспеў спакваля.
Хто выкрывальна
Скажа ў вочы слова,
А хто і матам.
Ну дык то здаля.
Мядзведзь – не дурань.
Не драмаў таксама.
Усіх адорваў
Па "заслугах" ён:
Для тых, хто мацюком, –
Штрафная яма,
Таго, хто толькі словам, –
З лесу вон!
Хоць "прышчык" ёсць,
Ды ніякога толку.
І каб гучнейшым быў
"Пратэстны хор",
Стварылі незалежную суполку
Барсук, лісіца, заяц і бабёр.
А перад тым,
Як "зжыць мядзведзя-гада",
На бунт,
Падняўшы ўвесь лясны народ,
Хто потым зойме
Царскую пасаду,
Абмазгаваць рашылі
Напярод.
Сказаў барсук:
– Даю на трон я згоду,
Уважу, так і быць... –
Сказаў барсук. –
Хоць хлеб нялёгкі –
Дагадзіць народу,
Але нічога...
Трон жа – ён не сук.
Аднак жа
"Тры капейкі ўставіў" заяц:
– Па мне
Карона будзе акурат,
Бо я ўжо кіраўнічы вопыт маю –
Лічы, кірую
"Ротай" зайчанят.
Бабра звычайна
"Не падняць дамкратам".
А тут, як танк,
У наступ ён папёр:
– Хто лічыцца
найпершым дэмакратам?
Ну я ж! А значыць,
На прастол – бабёр!
– Сябры мае!
Ну годзе вам сварыцца! –
Да іх лісіца. –
Мы ж адна сям'я.
Не цар патрэбен лесу,
А царыца,
Такая ж хітрамудрая,
Як я.
І чулі ў лесе,
Што тады ўсчалося
(Было на гэта варта й паглядзець):
Ляцела поўсць,
Ірвалася валоссе!..
З усмешкай
Пазіраў на іх мядзведзь...
А зрэшты...
І цяпер не позна згледзець.
І, нібы ў цырк,
Збіраюцца звяры,
Бо "шкуру
Незабітага мядзведзя"
Скубуць яны
Да гэтае пары.

***

Скажу я слова,
Хоць яно не нова
(Калісьці ўжо здаралася вось так):
Перачытайце спадчыну Крылова,
Дзе ёсць і рак,
І лебедзь,
І шчупак...

Пра "чэсных" і "нячэсных"

Ты – летапісец.
Ты заўжды павінен
Так жыць-пісаць,
Каб не крывіць душой.
Зарплата, кажаш,
Трэба "палавіне"?
Не можаш пра жыццё –
Пішы пра гной...
У Доме прэсы
Ад такіх аж цесна.
А ўсё чаму?
За што такі "пасаг"?
А ўсё таму,
Што ты, як кажуць, "чэсны".
"Нячэсных"
Адсялілі за абсяг.
Сваё сумленне
Ты прадаў за грошы,
Няма як жыць?
Ідзі вазі,
Грузі...



Ну чым, скажы,
Такі заробак горшы?
Сумленне чыстае,
Хоць рукі
У гразі.
Ты кажаш,
Што пятля вісіць на шыі,
Рот заціскае ўладная рука...
А што,
Цябе калісьці не душылі
Райкам, гаркам?
Бывала, што й ЦК.
Тады ты спрабаваў
Хоць мовіць слова,
Хоць неяк аддаваўся барацьбе!
І недарэмна
За перабудову
Удзячны людзі
Крышку і табе.
Цяпер ты згодзен
Гладзіць і падчэсваць,
Гаспадару наводзіш
Бляск і шык.
А ў той жа час
Калега твой "нячэсны"
За краты йдзе,
Хоць і зарплата – пшык.
Медальку ты прымерваеш
На лацкан
(А мо й для ордэна
Рыхтуеш дзіракол?..).
У залікоўку
Я, дэкан Булацкі,
Асінавы
Табе пастаўлю "кол"!

"Трайны тулуп" даяркі Фені

Фанфары адгрымелі
Урачыста!
Палац – як лялька!
Проста ўсім на ўздзіў!
І час чакаць,
Каб юных хакеістаў
Ён на карысць Радзімы напладзіў.
Ва ўсім раёне
"Прашарсцілі" школы,
Не абмінулі нават і садкі.
А ў выніку –
Малюнак невясёлы:
Упарцяцца дзяўчынкі-хлапчукі!
Хто ўжо адчайна паліць цыгарэты,
А хто і ў чарцы
Любіць бачыць дно...
Прымусам
Запісалі нават гэтых.
А колькасці патрэбнай –
Не відно.
У тым палацы
Ёсць жа і абслуга,
Сфарміраваны
паўнацэнны штат.
Няхай не ходзяць,
Мовіць так, "за плугам",
Аднак не адцураюцца зарплат!
Не скажаш жа Самому
праўду-матку...
І давялося
Зноў "ісці ў народ".
Калгасы атрымалі разнарадку:
Даярак, пастухоў – усіх на лёд!
Каб з клюшкай
Кожны быў механізатар!
Хай з прэзідэнта прыклад ён бярэ,
А жыта ці траву
Дакосіць заўтра.
А паслязаўтра
Дзе-нідзе ўзарэ.
Пляваліся старшыні:
– Як жа праца?
Такі гарачы час –
Хоць ты згары.
Ну хай бы нам банкір
Замест палаца
Аўтамабіль ці трактар падарыў.
Завялі нівы,
Апусцелі фермы...
Для моладзі –
Забыты шлях у клуб.
Затое – бач яе! –
Даярка Феня
Вось-вось асвоіць
Аж "трайны тулуп".
А слесар Толік –
З клюшкай, як Харламаў,
Нібы калісьці з гаечным ключом.
(І нават кажуць:
Мінскаму "Дынама"
Падставіць ён надзейнае плячо).
І блізка час,
Калі, як кажуць, з неба
Пружаны нахапаюць цуда-зор...
Але не знікла пільная патрэба:
Усё адно ў палацы недабор.
І прынялі ў адчаі зноўку меры.
Саломінка – тапельцу.
Балазе
У нас заўсёды ёсць пенсіянеры –
Апошні
І надзейны наш рэзерв...
Пабеглі агітатары па хатах...
І ім сказаў
Кульгавы дзед Кірэй:
– Як стане фігурысткаю Агата,
Тады і я паклыпаю ў хакей.
Не стане хакеістам
Дзед з кульцяпкай...
І для Пружан –
Сапраўдная бяда.
Заўпарцілася згорбленая бабка
І згоды не дала ім.
А шкада!

***

Растуць,
Растуць,
Нібы грыбы, палацы!
Не супраць я.
Не ў тым жа мой папрок.
Ды дзе ж нам
Пракаповічаў набрацца
На кожны наш раённы гарадок?

Горка!

А малайцы бальшавікі!
Рабілі пасядзелку,
А на парог жандар які,
Яны –
На стол гарэлку!
Пакруціць носам той жандар:
– Як коні,
Жлукцяць зранку!
Ад роспачы
Наморшчыць твар –
Не сходка тут,
А п'янка.
Гуляе, бач, рабочы клас,
І завітаў ён дарам...
Цяпер жа
Іншы час у нас,
І іншыя жандары.
...Такая радасць у мяне!
Рыхтуй пітво-аладдзі:
Ідзе дачушка пад вянец,
І трэба нешта ладзіць...
Не пацягнуць мне рэстаран,
Там грошай трэ' без меры.
Але ж і я не велькі пан,
Згуляем і ў кватэры.
Для талакі ўсяго стае,
І час пачаць вяселле.
І госці званыя мае
За стол радком паселі.
Язык свой вострыць
Тамада
(Нашто ж ён без'языкі?).
Ну, пачынайма ўжо, бадай,
Прыціхніце, музыкі!
І раптам...
У гасцей маіх
На лоб палезлі вочы.
Нібы кувалдай –
Гых ды гых! –
У дзверы хтось грукоча.
І галасы:
– Аткройце дзвер!
Заспелі нас знянацку.
Глядзім мы:
Міліцыянер,
А з ім – пяцёра ў "штацкім".
Як след, аддаў служывы чэсць
І гэтак грозна гляне!
– Нам саабшчылі:
Здзеся есць
Крамольнае сабранне.
Зарагаталі мы...
Аднак
Мент, не маргнуўшы вокам:
– Не скальце зубы!
Есць сігнал!
А свадзьба – маскіроўка.
Вы здзесь,
Мы знаем,
Неспраста.
Адсюль –
На Запад ніці.
А ну-ка дружна пашпарта
Уласці прад'явіце!
Ну, сапраўды, як кажуць, мент...
– Мясцовыя мы! Вось мы!
Хто ж на вяселле
Дакумент –
Той самы пашпарт –
Возьме?
А мент:
– Не знаю. Есць закон.
Імею я самненні.
І задзяржаць усіх даўжон
Да... эта... выяснення.
Жаніх прымервае кулак,
Дачка-нявеста ў слёзы!
Мы іх прасілі так і сяк,
Затым пайшлі пагрозы...
А ўрэшце
Быў расклад такі,
І быў такі рахунак:
Усё вяселле – ў "варанкі",
І ўсіх –
У пастарунак.

***

Ніхто не зможа
З нас усіх
Пазбегнуць акалодка,
Бо нават "выпіць на траіх"
Лічыцца будзе сходкай...

Яма



Пярэсты бык,
Як здань, худы
Ламаў ад злосці стойла.
Ён быў галодным,
Як заўжды,
І, сербануўшы пойла
(А пойла тое ўсё з вады),
Узяў на зуб саломы.
Ну што быку
З такой яды?
Пусты жывот, вядома,
І так было яно штодня.
Але быку аднойчы
Ветэрынар і старшыня,
Да іх –
Даглядчыкаў гайня
Патрапілі на вочы.
Ускочыў бык,
Парваў ланцуг
(Як не было знямогі),
Да іх панёсся ва ўвесь дух,
Як дзіды, ўзняўшы рогі.
Яны ж, калгасныя "кіты",
Ад страху
Аж прыселі
(І ўспомніў кожны з іх тады
Пра сілас
І пра сена...).
Не скажаш нават,
Далібог,
Хто быў найболей прыткі.
Упісваў кожны,
Колькі мог –
Ажно мільгалі лыткі!
Быў старшыня
Не надта зух –
І бег
Апошні самы.
Аж дух
Займала ад патуг.
А ззаду – рогі.
"Зух" наш – бух! –
У сіласную яму...
Ляцеў герой няўдалы наш
І, плюхнуўшыся гулка,
Падумаў:
"Быў бы тут сянаж –
Было б не гэтак мулка..."
Што ж, каб не мулялі бакі,
Кармы рыхтуй
У дзве рукі,
Бо можа вымысел такі
Ператварыцца ў яву.

***

Часцей,
Калгасныя быкі,
Старшынь ганяйце ў яму!

НУ И НУ!

Крыска Лариска забралась в "колыску"

Двухмесячный малыш стал объектом нападения крысы.

Об этом жутком случае написала газета "Вечерний Брест".

Не так давно ночью брестчане Оля и Дима были разбужены громким плачем своего двухмесячного сына Сережи. Рыдал не так, как обычно плачут дети в его возрасте, а резко, громко, словно от боли. Включив свет, родители с ужасом обнаружили, что у мальчика окровавлена ручка, а по комнате мечется огромная серая крыса. Ольга с родителями в этой малосемейке по улице Красногвардейской прожила 14 лет, но крысы хозяйничать в подвале стали только с недавних пор.

– Впервые мы услышали их примерно год назад летом. Это было еще до рождения ребенка. Тогда их, видимо, потравили, потому что вскоре грызуны исчезли, – вспоминает Ольга. – Но в этом году они появились снова. Шуршали под полом, скребли, бегали. Обычно, если кто-то стучал ногой по полу, шорохи прекращались. В квартире никто грызунов не видел.

В ночь с 28 на 29 июня крыса сделала лаз и попала в квартиру на первом этаже. Помещение маленькое, развернуться практически негде, но комнатка аккуратненькая и чистая. На первый взгляд, поживиться здесь крысе нечем. Остается только гадать, почему она полезла именно к ребенку, спавшему в своей кроватке на высоте сантиметров 80 от пола. Вероятно, взбиралась по креслу, стоящему рядом. Мерзкая тварь укусила малыша за мизинчик правой руки. От боли Сереженька проснулся. Успокоить его было крайне тяжело. А крыса сначала забилась за шкаф в комнате, а потом выбежала в кухню, где укрылась в газовой плите. Оказавшегося в ловушке грызуна поймали и убили.

Малыша отвезли в больницу, обработали ранку. От госпитализации родители отказались, назначенные уколы от бешенства продолжили делать амбулаторно в поликлинике.

Надо заметить, что блохи, живущие на грызунах, могут переносить чуму. Но только в очагах заражения.

Объяснение столь необычному поведению крысы дали в Брестском зональном центре гигиены и эпидемиологии. По словам заведующей отделением гигиенической дезинфекции Светланы Ракоть, накануне в доме, где произошел случай, проводилась плановая дератизация (уничтожение грызунов). Видимо, у крысы, успевшей вкусить отравы, болел живот, она искала питье. Инстинкт отправил ее спасаться к людям...

КРЫЖАВАНКА

Шляхі-дарогі Беларусі



Па гарызанталі: 3.Указальнік блытаных дарог на Беларусі ў даўнія часы. 8.Дарожны рабочы па ўкладцы дарог каменем. 9. ... або бат. Драўлянае многавёсельнае судна грузападымальнасцю да 40 тон, якое ў мінулыя часы перавозіла грузы па Нёмане і іншых рэках Беларусі. 12.Дарога з цвёрдым пакрыццём. 13.Тое, што служыць для падтрымкі моста. 14.Бясколерны газ. 15.Цэнтральная ... Месца ў Мінску, адкуль вядзецца адлік адлегласці да розных гарадоў Беларусі і іншых краін. 16.Чалавек, які кіруе коньмі ў запрэжанай павозцы. 19.Абгароджаная з двух бакоў дарога, па якой ганяюць на пашу жывёлу. 21.Судна з паравым рухавіком, якое ўпершыню на Беларусі з'явілася ў 20-я гады XIX ст. на Дняпры. 22.Старажытная назва р.Нёман, якая ўпершыню сустракаецца ў геаграфічным апісанні Клаўдзія Пталамея (II ст. н.э.) 24.Павел ... Беларускі этнограф, пісьменнік, падарожнік, аўтар нарысаў "Падарожжа па Палессі і Беларускім краі" і іншыя. Сёлета - 185 гадоў з дня яго нараджэння. 25.Уладзіслаў ... Беларускі і польскі паэт, пісьменнік, які шмат вандраваў па дарогах Беларусі. Аўтар кніг "Нёман ад вытокаў да вусця" і іншыя. Сёлета, у верасні, - 185 гадоў з дня яго нараджэння. 26.Аддзяка (разм.) 28.Шлях руху падарожнікаў, транспарту і іншае. 30.Асяданне, апусканне зямнога палатна нядаўна пабудаванай дарогі. 32.Ваеннае паруснае трохмачтавае судна. 33.Крыты аўтамабіль для перавозкі грузаў. 35.Напрамак лініі дарогі, канала і іншае. 38."... і яе берагі". Краязнаўчая праца беларускага археолага, гісторыка, этнографа Канстанціна Тышкевіча, які ў 1856 годзе арганізаваў экскурсію ўздоўж гэтай ракі. 40."Кацярынінскі ...". Так у народзе называлі і называюць сучасную аўтадарогу Івацэвічы–Слуцк–Бабруйск–мяжа Рэспублікі Беларусь. 41.Старадаўняе рачное судна даўжынёй 43–53 метры, на якім некалі па рэках Беларусі перавозілі грузы. 42.Вялікі князь ВКЛ, выдатны военачальнік, якому сёлета - 660 гадоў з дня нараджэння. 43.Бакавая нахільная паверхня дарожнага насыпу.

Па вертыкалі: 1.Першы зменшаны чарцёж тэрыторыі ВКЛ, які па ініцыятыве і за сродкі Мікалая Радзівіла (Сіроткі) быў выдадзены ў 1603 годзе. 2.Будынак на чыгуначнай станцыі, прыстані. 3.Чатырохколавы конны экіпаж на рэсорах. 4.Заселеная людзьмі месца, якое на Беларусі ўзнікала звычайна на месцы пераправы праз раку. 5.Імчыцца абоз на сотні калёс (заг.). 6.На Ляксея пакідай сані, рыхтуй ... (прык.). 7.Горад на Віцебшчыне, буйнейшы чыгуначны вузел Беларусі. 10.Каб устала, дык да неба б дастала. (заг.). 11.У мінулыя часы праваднік гандлёвых суднаў на рэках Беларусі. 17.Камандзір судна, спартыўнай каманды. 18.Шлях да падыходу да горада, ракі і іншае. 19.Дзяржаўная ўстанова, бездакорная дзейнасць якой ва многім залежыць ад стану дарог. 20.Невялічкае засеянае поле. 22.Ляціць без крыл, бяжыць без ног (заг.). 23.Уласаў дзень - каровінае ... (прык.). 27.Насціл з бярвення ці галля для праезду на гразкім месцы дарогі. 29.Той, хто заняты пошукам, здабываннем чаго-небудзь. 31... ці нагляд за станам аўтамабільных дарог, які выконваюць на Беларусі ўстановы па рамонце і эксплуатацыі дарог (ДРБУ, ДЭУ і іншыя). 34.Заходняя ... Адна з рэк Беларусі, па якой некалі плытагоны сплаўлялі лес у краіны Балтыі. 35.Даўні народны звычай беларусаў калектыўнай дапамогі ў гаспадарчых работах. 36.Саюз, аб'яднанне. 37.Кругладонныя хадавыя судны грузападымальнасцю ад 48 да 160 тон, якія некалі будаваліся на рэках Заходні Буг і Мухавец. 39.Невялікая шлюпка. 40.Горад на Магілёўшчыне, які ў пачатку XIX ст. быў важным гандлёвым цэнтрам на Беларусі, з прыстанню на Дняпры.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.
г.Дзяржынск.

Беларуская мова – праваднік еўрапейскай культуры

Унікальны праект пачалі ажыццяўляць некалькі год таму назад нашы энтузіясты-літаратары – пераклад на беларускую мову целай калекцыі твораў чэшскіх класікаў, прадстаўнікоў сучаснай літаратуры Чэхіі.

У чэшскай амбасадзе ў Мінску нядаўна прайшла прэзентацыя серыі "Чэшская калекцыя": чатыры кнігі ў перакладзе на беларускі, выпушчаныя ў выдавецтве "І.П.Логвінаў", былі прадстаўлены аматарам літаратуры.

Серыя адкрываецца кнігай Ганы Андранікавай "Гук сонечнага гадзінніка" ў перакладзе Веранікі Бяльковіч, якая заваявала шэраг прэстыжных прэмій у сябе на радзіме. Тут жа і кніга Яраслава Рудзіша "Неба пад Берлінам", яна стала ў Чэхіі ўжо культавай і перакладзена на многія іншыя мовы Еўропы, а таксама "Сямейная" кніга бацькі і двух сыноў Топал "Анёл". Выданне "Чэшскай калекцыі" ў Беларусі здзяйсняецца пры дапамозе Міністэрства культуры Чэшскай Рэспублікі. Зараз рыхтуюцца да выхаду па-беларуску зборнік эсэ Вацлава Гавела, творы Ладіслава Клімы, Міхея Вівела і іншых знакамітых людзей гэтай краіны.

Галіна ЯФІМАВА.

Брэсцкая крэпасць атрымае новы статус?

Гістарычны комплекс можа быць унесены ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Беларускіх "намінантаў" выбіралі эксперты ЮНЕСКА па выніках рабочай "экскурсіі", дзе яны рупліва і строга вывучалі патэнцыял помнікаў гісторыі ва ўсіх кутках краіны.

ПАСЛУГІ
Прыём шклатары і іншая дапамога жадаючым.
Тэл. (8-033) 661-11-87 (МТС).

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 16.07.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №